

КЛУБНІЦЫ І ЧАРЭШНЯ: ШУКАЕМ, ДЗЕ ТАННЕЙ **5**

ЧАМУ Ў АГРАГАРАДКУ НЕ СВЕЦЯЦЬ ЛІХТАРЫ МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 109 (29478)

+TVПРАГРАМА МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Для актывізацыі турызму, у тым ліку ўнутранага, нароўні з сістэмнымі рашэннямі на ўзроўні дзяржавы вельмі важныя крокі, якія робяцца на месцах. Маладзёжнай аўдыторыі, напрыклад, неабходна даносіць інфармацыю праз сацсеткі, месенджары, дадаткі. Нароўні з інфармацыйным складнікам неабходна падцягваць пад патрэбы турыстаў інфраструктуру, прапаноўваць ім камфортныя ўмовы размяшчэння, добрую кухню. У сферы паслуг спрыяльныя магчымасці адкрываюцца перш за ўсё для прыватнага бізнесу. У рэгіёнах усе кірункі турызму — падзейнага, гастранамічнага, рэлігійнага, медыцынскага і прамысловага — павінны развівацца ў комплексе. У Беларусі ёсць што паказаць гасцям. Але вельмі важна ініцыятыўна працаваць па ўсіх напрамках».*

# Гаючая вада сваёй зямлі



Малады ветурач сельгаспрадпрыемства «Александрыйскае» Шклоўскага раёна Крысціна ХАРКЕВІЧ на шляху да працы альбо вяртаючыся дадому часта спыняецца на ўскраіне вёскі Прасалы, каб пабыць на аднаўленай мясцовымі аматарамі-майстрамі крыніцы, адпачыць, напіцца і набраць з сабой вады, якая не толькі смачная, але, як кажуць, і гаючая.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Беларусь у студзені — красавіку павялічыла экспарт тавараў і паслуг на 28,6 % да $14,19 млрд.**
- «Белпошта» і Ozon заключылі пагадненне аб дастаўцы тавараў маркетплейса ў Беларусі.
- **Інфляцыя ў Беларусі ў маі склала 0,6 %.**
- Падпісаны акт прыёмкі ў прамысловую эксплуатацыю першага энергаблока БелАЭС.

Парламенцкі дзённік

## Неабходнасць перамен у адукацыі наспела

**Учора прайшлі парламенцкія слуханні «Нацыянальная сістэма адукацыі: стан, заканадаўчае рэгуляванне, шляхі ўдасканалення», дзе, у прыватнасці, абмяркоўвалі ўзаемадзеянне прадпрыемстваў з установамі прафесійнай адукацыі, удасканаленне адукацыйнага працэсу ў ВНУ з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, магчымасці дадатковай адукацыі ў папулярызацыі і развіцці навыкаў і ўменняў адораных дзяцей і моладзі, ролю маладзёжнага руху ў фарміраванні грамадзянскай адказнасці навучэнцаў. Адна з новых прапаноў, якая прагучала ад Міністэрства адукацыі і, магчыма, будзе ўведзена, — абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі пры паступленні ў ВНУ.**

### ВЯРНУЦЬ НАСТАЎНІКАМ ВЫСОКІ СТАТУС

У слуханнях прымалі ўдзел дэпутаты і сенатары, прадстаўнікі міністэрстваў і дзяржаўных камітэтаў, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, іншых дзяржаўных органаў, устаноў адукацыі, прадпрыемстваў і грамадскіх аб'яднанняў, студэнты.

СТАР. 4

## НеЧарнобыль, або Вяртанне дадому

**На Гомельшчыне працягваецца абмеркаванне праекта новай праграмы адраджэння чарнобыльскіх зямель. Адпаведнае даручэнне даў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Выпрацаваць дакумент неабходна да верасня, а галоўная задача новай праграмы — збалансаванае і комплекснае развіццё раёнаў Гомельскага рэгіёна, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.**

### Ад праекта да выразнай дарожнай карты

У праграму ўключаны Хойніцкі, Брагінскі, Нараўлянскі, Лельчыцкі і Ельскі раёны. Пакуль агучаны прамежкавыя вынікі будучай праграмы. Акцэнт зроблены на вызначэнне канкрэтных аб'ектаў, на якія будзе нацэлена работа, і мерапрыемствы, што плануюць рэалізаваць.

— Асноўны акцэнт павінен быць зроблены на прамысловую вытворчасць, — падкрэсліў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** падчас нарады па абмеркаванні праекта новай праграмы адраджэння чарнобыльскіх зямель. Так, важна вызначыць у раёнах прадпрыемствы, куды будуць накіраваны асноўныя сілы па мадэрнізацыі, удасканаленні працэсу, стварэнні новых вытворчасцяў, перспектыве адкрыцця новых працоўных месцаў. Напрыклад, у Нараўлянскім раёне далейшае развіццё павінна атрымаць ААТ «Чырвоны Мазыранін».

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Мы гатовыя да дыялогу, але не да прымусу»

## Дэпутаты ўсіх узроўняў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу прынялі зварот да міжнароднай супольнасці ў сувязі з сітуацыяй вакол Беларусі

«Мы, дэпутаты і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — паўнамоцныя прадстаўнікі беларускага народа, звяртаемся да сусветнай супольнасці з заклікам непрадузята ацаніць сітуацыю, якая складваецца вакол нашай краіны, калі пад выглядам барацьбы за дэмакратычныя каштоўнасці, па сутнасці, маюць месца агрэсіўныя ўсебаковы ціск на суверэнную дзяржаву і яе грамадзян, грубае парушэнне базавых прынцыпаў міжнароднага права па неўмяшанні ва ўнутраныя справы дзяржаў. Такія дзеянні ствараюць рэальную пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы, парушаюць агульнапрызнаныя палажэнні Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, адной з заснавальніц якой была і наша краіна, — гаворыцца ў звароце. — Незалежнасць, развіццё чалавечага патэнцыялу, эканамічны рост і ўмацаванне Беларусі з'яўляюцца як відавочнай асновай дабрабыту жыхароў нашай краіны, так і залогам геапалітычнай стабільнасці у вялізным рэгіёне, які злучае Еўропу, Расію і Азію».

Аўтары звароту лічаць, што замест падтрымкі і развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва цэлы шэраг дзяржаў актыўна спрыяе дэстабілізацыі абстаноўкі ў Рэспубліцы Беларусь — супраць нас разгорнута масіраваная інфармацыйная агрэсія, накіраваная як на ўцягванне нашых грамадзян у дэструктыўную дзейнасць з мэтай здзяйснення дзяржаўнага перавароту, так і на фарміраванне вельмі негатыўнага ладу краіны на міжнароднай арэне.

«Уводзяцца беспрэцэдэнтныя і неабгрунтаваныя санкцыі. Абсурднымі выглядаюць дзеянні па пазбаўленні Рэспублікі Беларусь правоў на правядзенне міжнародных спартыўных спаборніцтваў, удзел у творчых і прафесійных конкурсах, забарона на ажыццяўленне авіязносін, дыскрымінацыя кампаній і арганізацый, а ў канчатковым выніку — звычайных грамадзян нашай краіны. Беларусы вытрымаюць гэтыя выпрабаванні, таму што нам ёсць што губляць. У XX стагоддзі мы двойчы аднаўлялі сваю краіну — з руін Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў і аскепкаў разбуранага ў 1991 годзе СССР. Таму не толькі моцная дзяржаўная ўлада і моцныя органы правапарадку не дазволіліператварыць Беларусь у чарговую гарачую кропку на палітычнай карце свету, але і кожны беларус адчувае дачыненне да стварэння краіны, разумее сваю адказнасць за яе будучыню», — адзначаецца ў дакуменце.

«Сёння палітычны і эканамічны ціск на нашу краіну не спыняецца, а толькі ўзмацняецца. Заяўленая мэта — садзейнічанне ўмацаванню дэмакратычных каштоўнасцяў і свабод. Аднак фактычны вынік цалкам іншы — падрыў эканамічнага патэнцыялу нашай краіны, запаволенне развіцця, скарачэнне сацыяльных праграм, зніжэнне дабрабыту людзей і, як вынік, злом суверэннай беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне зоны эканамічнай, геапалітычнай, сацыяльнай нестабільнасці ў самым цэнтры Еўропы, якая і так перажывае цэлую чараду крызісаў: міграцыйны, эканамічны, пандэмію COVID-19, — падкрэсліваюць дэпутаты і сенатары. — Мы звяртаемся да нашых замежных партнёраў з заклікам: паважайце прынцыпы і нормы міжнароднага права ва ўзаемаадносінах з Беларуссю, бо, знішчыўшы іх аднойчы, зноў надаць ім значнасць будзе складана. Мы гатовыя да дыялогу, але не да прымусу, і адказна заяўляем аб бесперспектыўнасці і недальнабачнасці любых замахаў на наша права самастойна выбудоўваць шлях развіцця Рэспублікі Беларусь».

«Мы заклікаем сусветную супольнасць выступіць супраць неабгрунтаванай, контрпрадукцыйнай і дыскрымінацыйнай палітыкі ў адносінах да Рэспублікі Беларусь, праявіць салідарнасць з нашай краінай у адстойванні права на суверэнітэт і мірнае жыццё, вярнуцца да адказнага і канструктыўнага ўзаемадзеяння на карысць усіх краін і народаў, у імя міру, бяспекі і працвітання», — рэзюмуецца ў дакуменце.

Як адзначыла **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** тыя, хто выступае за ўвядзенне санкцый, а гэтыя людзі ў асноўным жывуць за межамі нашай краіны, выступаюць супраць народа, супраць асноў нашай дзяржавы, у цэнтры ўвагі якой — чалавек.

«Дэпутатаў усіх узроўняў, прадстаўнікоў народа ў нас больш за 18 тысяч чалавек. Мы маем шмат зносін з людзьмі і адчуваем, што людзі абураны несправядлівасцю ў адносінах да Беларусі. Бо асноўная мэта дзяржаўнай палітыкі — рост дабрабыту людзей, а заклікамі да санкцый перасякаецца гэта чырвоная рыса. У Беларусі робіцца ўсё, каб захаваць мір, стабільнасць і спакой у краіне. Але знаходзяцца тыя, хто спрабуе знішчыць працоўныя калектывы, прадпрыемствы, аслабіць эканоміку з мэтай, як яны самі кажуць, «справакаваць галодныя бунты», а ў выніку — пазбавіць краіну дзяржаўнасці і суверэнітэту.

Нас гэта не проста непакоіць, а абурае! Менавіта таму мы ўсе разам звярнуліся да сусветнай супольнасці, мы хочам спынення знешняга ціску на Беларусь!» — заявіла Наталля Качанава.

# «Палітычны генацыд і спроба рэйдарства ў адносінах суверэннай дзяржавы»

## Па просьбе «Звязды» апошнія падзеі пракаментавалі дэпутаты ўсіх узроўняў і спецыялісты, якія маюць дачыненне да розных сфер

**Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў,** аналізуючы сітуацыю, сказаў, што Беларусь аказалася на кірунку галоўнага ўдару, як здаралася неаднойчы ў гісторыі.

«Калектыўны Захад узяў курс на дэмантаж усёй сістэмы міжнародных адносін, уключаючы асновы міжнароднага права», — працягнуў парламентарый.

Па яго словах, дамоўленасці, якія фарміравалі апошнім часам міжнародны парадак, былі закладзены Ялцінскай канферэнцыяй і Хельсінскім актам 1975 года. Апошні, дарэчы, устанавіў непарушнасць сённяшніх граніц у Еўропе пасля Другой сусветнай вайны.

«Ад гэтай сістэмы імкнуцца адмовіцца. У выніку ігнаруюцца прынцыпы вяршэнства права, ігнаруецца суверэнітэт нацый, ігнаруецца прынцып неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў», — дадаў Андрэй Савіных.

Пры гэтым, заяўляе парламентарый, Захад не ўлічвае, што ён сёння займае толькі трэціну свету, а вялікая колькасць дзяржаў не толькі яго не падтрымлівае, але і гатова супрацьстаяць гэтым тэндэнцыям.

«Гэта так па адной простай прычыне: злом такога маштабу фактычна ставіць пад пагрозу міжнародную супольнасць. Таму мы ўпэўнены, што Рэспубліка Беларусь знойдзе саюзнікаў і падтрымку ў свеце», — рэзюмуе старшыня Пастаяннай камісіі.

**Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ,** адзначае: людзі ў рэгіёнах не разумеюць, за што калектыўны Захад фактычна аб'явіў вайну нашай краіне.

«За што? За тое, што Беларусь, шматпакутная краіна, якая вынесла на сваіх плячах найскладанейшую вайну, страціла кожнага трэцяга? Напярэдадні такой памятнай даты — 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны — нас зноў хочуць паставіць на калені і навучыць жыць па чужых законах і правілах. Нашто вы падманвалі нас усе мінулыя гады, калі казалі пра важнасць плюралізму, суверэннага развіцця? Навошта вы сёння парушаеце ўсе правы і правілы, якія вы ж і прапісалі?» — звяртаецца дэпутат да еўрапейскіх калег.

Яна кажа, што сёння Беларусь не засталася адна і навучылася прадаваць свае тавары ва ўмовах пермаментных санкцый. «Нашы прадпрыемствы, я ўпэўнена, здольныя будуць знайсці рынкі збыту. Самае галоўнае — мы за гэтыя гады не пераставалі выпускаць вартую, дастойную прадукцыю, якая будзе патрэбна калі не на Захадзе, то на Усходзе», — дадае Лілія Ананіч.

**Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве:**

— Усё, што адбываецца цяпер вакол нашай краіны, падобна на вар'яцтва. Далучаючыся да санкцый, многія дзяржавы, напэўна, нават не задумваюцца аб эканамічных і палітычных наступствах, з якімі могуць сутыкнуцца ў тым ліку і іх краіны. Між тым санкцыі — гэта пакаранне для парушальніка. Што парушыла Беларусь? Асобныя «палітычныя лідары» заяўляюць, што «ўвядзенне санкцый з'яўляецца адзіным спосабам нашкодзіць «рэжыму». Санкцыі выступаюць «за дэмакратыю». Выснова напрошваецца адна: хто не з намі, той супраць нас — вось і ўся «дэмакратыя». Гучаць заклікі ўзмацніць абмежавальныя меры, маўляў, свет павінен зразумець, што зараз перажываюць беларусы. Адно пытанне: адкуль вы, седзячы далёка за межамі Беларусі, ведаеце, што перажываюць беларусы? Вы нас спыталі? Вядома, што любыя эканамічныя санкцыі — гэта ўдар у першую чаргу якраз па простых беларусах: гэта працоўныя месцы, заработная плата, сацыяльныя выплаты. Да таго ж, калі Беларусь пазбаўляюць магчымасці праводзіць міжнародныя спаборніцтвы, удзельнічаць у фестывалях, караюцца не толькі беларусы, але і замежныя грамадзяне, якія з задавальненнем прыязджаюць у нашу краіну. Хочацца верыць, што здаровы розум усё ж пераможа. Менавіта таму парламентарыі Беларусі звяртаюцца да сусветнай супольнасці.

**Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, старшыня Наваполацкага гарвыканкама, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**

— Еўрапейскія і амерыканскія чыноўнікі працягваюць практыку эканамічнага і псіхалагічнага ціску, спрабуюць распаліць нянавісць і недавер паміж грамадзянамі Беларусі. Разлік, зразумела, на тое, каб былі пратэсты.

Тыя, хто расказвае пра неабходнасць усталявання ў Беларусі «дэмакратыі, свабоды, ліберальных асноў», хочуць прапанаваць грамадзянам нашай краіны забыць пра тое, што ў кожнага народа ёсць свой шлях, гісторыя, традыцыя... Упэўнены, Пераважная большасць беларусаў не хочуць жыць у дзяржаве, якая будзе ў якасці «прыслугі» перад тымі, хто жыве на захадзе.

Беларусь — самадастатковая краіна, якая можа для сябе вызначаць прыярытэты знешняй палітыкі, у адпаведнасці з патрабаваннем часу вырашаць праблемы і знешнія выклікі.

**Андрэй БУГРОЎ, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Дэпутаты Мінскага гарадскога Савета падтрымалі зварот дэпутацкага корпуса нашай краіны і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь да сусветнай супольнасці ў сувязі з сітуацыяй вакол Беларусі. Мы, дэпутаты гарадскога Савета, лічым недапушчальным увядзенне эканамічных санкцый супраць Беларусі. Бо іх мэта — нанясенне шкоды і значных страт нашым прадпрыемствам, а ў выніку — усяму народу Беларусі. За якія грахі? Мы ж, беларусы, — мірныя людзі!

Агульнае меркаванне маіх калег-дэпутатаў са сталічнага гарсавета: падобныя паводзіны калектыўнага Захаду ў адносінах да нашай краіны з'яўляюцца нічым іншым, як палітычным генацыдам і спробай рэйдарства ў адносінах суверэннай дзяржавы.

**Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Дэпутаты Гомельскай абласці актыўна падтрымалі ініцыятыву Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і паставілі свае подпісы пад зваротам да сусветнай супольнасці. Інакш і быць не магло: бо дэпутаты з'яўляюцца выразнікамі меркаванняў сваіх выбаршчыкаў, а кожны з выбаршчыкаў хоча жыць у міры, дастатку і згодзе з самім сабой і з тымі, хто побач. Лічу, што зварот да сусветнай супольнасці паспрыяе яднанню нашага грамадства, што асабліва важна ў Год народнага адзінства. Беларусы адкрытыя да дыялогу з усімі, гатовыя да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў розных сферах. Адзіная ўмова — павага беларускага суверэнітэту, традыцый нашай дзяржаўнасці.

**Ірына НЕГЯРЫШ, старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Зварот да міжнароднай супольнасці падтрымалі ўсе дэпутаты нашага раённага Савета і сельскіх Саветаў. Мы выступаем супраць любога замежнага ўмяшальніцтва і асуджаем любыя санкцыі супраць нашай краіны.

У звароце гаворыцца, што сёння кожны беларус адчувае сваё дачыненне да будаўніцтва краіны і разумее адказнасць за яе будучыню. Пацвярджэнне апошняму мы знаходзім у кожным працоўным калектыве, кожным сельскім Савеце. Нашы людзі вырошчваюць хлеб, займаюцца стваральнай працай. Нам не патрэбны напружанасць і супрацьстаянне. Камянецкі раён мяжуе з Еўрасаюзам, і мы выступаем за канструктыўныя, добрасуседскія адносіны з усімі людзьмі. Мы хочам ездзіць адно да аднаго ў госці, праводзіць сумесныя культурныя, спартыўныя мерапрыемствы, што становіцца немагчыма ў выніку ўвядзення санкцый. Трэба шукаць шляхі збліжэння, а не аддаляцца і не варагаваць — такой пазіцыі прытрымліваецца абсалютная большасць нашых дэпутатаў.

**Уладзімір ТРУТНЕЎ, старшыня Адэльскага сельскага выканаўчага камітэта Гродзенскага раёна:**

— Многія нашы вяскоўцы, з кім мне давялося сустракацца па службовых абавязках і проста ў прыватнай гутарцы, выказалі падтрымку нашым дэпутатам, якія звярнуліся да міжнароднай супольнасці ў сувязі з санкцыямі і ціскам на беларускі народ. Нашы жыхары і самі гатовы падпісацца пад гэтым дакументам. Некаторыя адкрыта казалі: чаго гэта замежнікі так упарта лезуць у нашы справы? Мяне, як прадстаўніка ўлады і як простага чалавека, непакоіць такая агрэсія, асабліва тыя санкцыі, якія інакш як абсурднымі не назавеш. Хоць ціск на краіну вядзецца па зразумелым прынцыпе: выйграць у геапалітычным сэнсе. І тут усе сродкі ідуць у ход, канчатковая мэта якіх — растаптаць краіну, унесці хаос, зламаць суверэнную Беларусь. Яны хочуць, каб народ пайшоў супраць свайго кіраўніцтва, але такога не будзе. Наадварот. Гэтымі санкцыямі яны людзей больш згуртавалі і аб'яднаслі. Людзі злыя на такія выпады. Атрымліваецца зваротны эфект. Ніхто не верыць у тыя папуліцкія доказы, якія гучаць з боку некаторых прадстаўнікоў Захаду.

**Настасся МАРЫНІНА, генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола, старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя спартыўнай прэсы»:**

— Выпадкі, калі з-за палітычных баталій на сусветнай арэне цэлыя зборныя не прымалі ўдзел у Алімпіядах, мы ўжо праходзілі ў 1980 і 1984 гадах. І пакуль палітыкі дамагаліся сваіх мэт, у той сітуацыі пацярпелі ў першую чаргу спартсмены, калі лёс і кар'ера некаторых і зусім аказаліся зламанымі. Спробы ўцягнуць атлетаў у палітычную барацьбу і зрабіць разменнай манетай — гэта ў першую чаргу з'яўляецца парушэннем Алімпійскай хартыі, якая сцвярджае: разумеючы, што спорт функцыянуе ў рамках грамадства, спартыўныя арганізацыі ўнутры Алімпійскага руху павінны вытрымліваць палітычны нейтралітэт. У гэтым жа дакуменце адзначаецца, што ажыццяўленне правоў і свабод, якія прадугледжваюцца сапраўднай Алімпійскай хартыяй, павінна быць забяспечана ў адсутнасць якой-небудзь формы дыскрымінацыі — расавага, моўнага, рэлігійнага, палітычнага характару.

Традыцыі

# ГОНАР КРАІНЫ

## У Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы адбыўся юбілейны — 65-ы — выпуск







**КОЖНЫ суворавец ведае прымаўку: той, хто не паступіў у сувораўскае вучылішча, павінен радавацца, а хто паступіў, — ганарыцца. І сапраўды, сённяшнія выпускнікі ўсе як на падбор: прыгожыя, статныя, выхаваныя, адукаваныя, спартыўныя. Нават і не скажаш, што пяць гадоў таму гэтыя юнакі прыйшлі сюды дзецьмі. Цяпер яны — сапраўдныя мужчыны. І абсалютна няважна, што многім з іх няма яшчэ і 18-ці.**



— Выпускнікі вучылішча заўсёды складалі яго гонар, з'яўляліся ўзорам выканання воінскага і грамадзянскага абавязку, — адзначыў **намеснік міністра абароны генерал-маёр Андрэй ЖУК**. — Многія выпускнікі Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча сёння праходзяць службу на вышэйшых пасадах ва Узброеных Сілах і іншых сілавых структурах дзяржавы, забяспечваючы яе бяспеку і суверэнітэт, працуюць на адказных дзяржаўных пасадах. Выхаваныя на слаўтых баявых традыцыях, яны ўпісалі нямала яркіх старонак у гераічны летапіс савецкіх і беларускіх Узброеных Сіл. Сённяшнія выпускнікі прымнажаюць слаўтыя традыцыі сувораўскага вучылішча выдатнымі поспехамі ў вучобе і высокімі дасягненнямі ў спорце.

І гэта не гучныя словы. Адзін з выпускнікоў вучылішча, Станіслаў Прытуленка, з'яўляецца стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі — падчас вучобы ён паказваў добрыя вынікі на спаборніцтвах па мнагаборстве. Юнак родам з Глуска, што ў Магілёўскай вобласці. Пра сувораўскае вучылішча марыў з самага дзяцінства — сур'ёзна пра яго задумаўся, калі аднойчы пaглядзеў парад. «Мяне так уразіў сувораўскі шыхт, што пасля шостага класа я вырашыў паступаць у вучылішча, — расказвае выпускнік. — Падрыхтоўка да іспытаў была сур'ёзная, конкурс таксама, таму калі я паступіў, то радасці не было канца».

Неўзабаве мара Станіслава ажыццявілася — праз некаторы час ён ужо сам маршыраваў у сувораўскім шыхце на парадзе ў Дзень Незалежнасці. Гэта надзвычай сімвалічна для нашчадка тых, хто ў далёкія 1940-я сам здабываў Перамогу. Прадзед Станіслава быў камандзір танкавага ўзвода, прайшоў усю вайну. Прабабуля трапіла на прымусовыя работы ў Германію, але і там знайшла спосаб помсціць ворагу: на авіязаводзе, дзе яна працавала, наўмысна рабіла дзіркі на некаторых дэталях. Яны, безумоўна, ганарыліся б сваім праўнукам-суворaўцам, які збіраецца паступаць у Беларускую дзяржаўную акадэмію авіяцыі.

Сёлета са сцен вучылішча выйшла 70 суворaўцаў. Сярод выпускнікоў — адзін сярэбраны і пяць залатых медалістаў. З адзнакай скончыў сувораўскае і Ягор Барсамян. Юнак будзе працягваць сваю адукацыю ў Ваенна-медыцынскай акадэміі імя Кірава ў Санкт-Пецярбургу — дзякуючы атэстату з высокімі адзнакамі, ён ужо паступіў туды па-за конкурсам (дарэчы, прывілеі пры паступленні даюцца суворaўцам і ў ВНУ сілавога блока нашай краіны). Мама Ягора, якая прыйшла на выпускны, расказала, што ў свой час з трывогай успрыняла сынава рашэнне паступаць у сувораўскае вучылішча, аднак з цягам часу ніколькі аб гэтым не пашкадавала. «Тут з маленькіх хлопчыкаў выхоўваюць сапраўдных мужчын», — ганарыцца сынам Ася Барсамян.

— Мы рыхтуем сапраўдных прафесіяналаў і грамадзян нашай краіны, — перакананы **начальнік Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча палкоўнік Андрэй ГАРБАЦЕНКА**. — Вядома, яны паказваюць добрыя вынікі і ў вучобе, і ў спорце, але самае галоўнае, што ў сценах вучылішча суворaўцы навучыліся сябраваць: падтрымліваць, дапамагаць, суперажываць адзін аднаму. За пяць гадоў яны ўвабралі ў сябе гэтыя дух кадэцтва, які, упэўнены, пранясуць праз усё сваё жыццё. Абсалютная большасць сённяшніх выпускнікоў ідзе вучыцца ў ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў для Узброеных Сіл, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і іншых сілавых структур. Гэта патрыёты сваёй краіны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Парламент Албаніі абвясціў імпічмент прэзідэнту краіны



Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва Associated Press. За імпічмент прагаласавалі 104 члены парламента, супраць — толькі сем. Яшчэ трое ўстрымаліся. Цяпер на працягу трох месяцаў рашэнне аб адхіленні яго ад пасады павінен ухваліць Канстытуцыйны суд Албаніі. Галасаванне адбылося пасля таго, як парламенцкае расследаванне выявіла, што прэзідэнт Албаніі Ілір Мета парушыў Канстытуцыю «перадузятым падыходам» да кіруючай Сацыялістычнай партыі падчас парламенцкай выбарчай кампаніі ў красавіку гэтага года. Сам Мета раскрытыкаваў расследаванне і працэс імпічмэнту, назваўшы іх незаконнымі. Прэзідэнт у Албаніі выконвае, галоўным чынам, цырыманіяльныя функцыі, але валодае некаторымі паўнамоцтвамі ў судовай уладзе і ў ваеннай сферы.

### Біткоін заўважна падаражэў пасля прызнання яго афіцыйным сродкам плацяжу ў Сальвадоры



Біткоін апошнім часам дадаў у кошце больш чым на 10 працэнтаў. Крыптавалюта падымалася вышэй за $ 37 500. Падаражанне пачалося пасля таго, як заканадаўчая асамблея Сальвадора ўхваліла закон, па якім біткоін прызнаецца афіцыйным сродкам плацяжу ў краіне разам з доларам ЗША, падкрэсліў CNBC. Сальвадор стаў першай краінай у свеце, якая ўзаконіла біткоін у такім статусе. Прэзідэнт краіны Наіб Букель падкрэсліў, што прызнанне біткоіна прынясе краіне інвестыцыі, паток турыстаў, інавацыі і эканамічнае развіццё. Адна з заяўленых пераваг крыпты — спрашчэнне пераводаў дадому з-за мяжы, якія складаюць значную частку эканомікі Сальвадора. Між тым яшчэ паўтара месяца таму біткоін каштаваў прыкладна $64 000, дасягнуўшы гістарычнага максімуму. Аднак пасля крыпта ў асноўным таннела.

Блізкая ўлада

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 12 чэрвеня, з 9.00 да 12.00, правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
• кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;
• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
• кіраўнік спраў старшыня Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44

Надвор'е

## Вецер з Балтыі: цёпла і дажджліва

### Але ў нядзелю крыху пахаладае

**Не вельмі ўтульнае гэта надвор'е, калі да нас ідзе няўстойлівая паветраная маса. А яно будзе такім і ў гэтыя выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Уначы на суботу надвор'е вызначыць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў, удзень пад уплывам няўстойлівай паветранай масы і атмасфернага фронту, які ссоўваецца з Балтыйскага мора, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер уначы няўстойлівы слабы, удзень заходні, паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 цяпла. Удзень сонца прыгрэе не на жарт: будзе ад плюс 22 градусаў да 28 цяпла.

А вось у нядзелю нас чакае невялікае пахаладанне. У гэты дзень захаваецца ўплыў атмасфернага фронту, услед за якім на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць халодная няўстойлівая паветраная маса са Скандынавіі. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Вецер заходні чвэрці ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9—15 градусаў. Удзень стане трошкі свяжэй: ад плюс 18 градусаў да 24 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е будуць вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і няўстойлівая паветраная маса. Уначы месцамі, а ўдзень пераважна па паўднёва-ўсходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў. Удзень будзе 17—24 цяпла. Амаль марское надвор'е чакае нас і ў аўторак. Уначы 15 чэрвеня надвор'е ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, раніцай і ўдзень адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які ссоўваецца з боку Балтыйскага мора. Уначы па паўднёвым усходзе, раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагназуюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў. Удзень будзе 18—25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ: ЧАРГОВЫ, ПЯТЫ ПА ЛІКУ, З'ЕЗД АДБУДЗЕЦЦА ВОСЕННЮ

Учора прайшло пасяджэнне праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Разглядаўся цэлы шэраг актуальных пытанняў, у тым ліку падводзіліся вынікі работы творчага саюза за першае паўгоддзе. Размова ішла пра камплектаванне бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры кнігамі айчынных сучасных літаратараў. Таксама адбыўся прыём у члены СПБ новых сяброў. У кагорту прафесійных літаратараў залічаны сем новых калег. Сярод іх — паэты, публіцысты.

Старшыня СП Беларусі Мікалай Чаргінец агучыў і тое, што вядзецца шырокая падрыхтоўка да чарговага, пятага па ліку, з'езда пісьменніцкай арганізацыі. Мяркуецца, што прэстыжны выніковы форум адбудзецца восенню 2021 года.

Удзел у пасяджэнні праўлення прынялі прадстаўнікі міністэрстваў — інфармацыі, культуры, адукацыі, якія звярнулі ўвагу на пытанні прапаганды мастацкай літаратуры, на арганізацыю болей шчыльнага ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання з пісьменніцкай арганізацыяй.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Прыёмная кампанія — 2021

# ЭКЗАМЕН З ВЫСОКІМІ СТАЎКАМІ

## Для абітурыентаў у авіяцыйнай галіне адкрываюцца новыя магчымасці

**Падрыхтоўка пілотаў для грамадзянскай авіяцыі распачнецца сёлета ў Беларусі. Пра гэта расказаў журналістам прарэктар па выхаваўчай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Ігар ЯЦКЕВІЧ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ён адзначыў, што гэта новая старонка ў гісторыі навучальнай установы. Пачынаючы з 1974 года тут рыхтавалі авіяцыйны персанал самага рознага профілю: інжынерна-тэхнічных спецыялістаў, якія займаюцца абслугоўваннем паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў, авіяцыйнага абсталявання, а таксама авіяцыйных дыспетчараў. Але не хапала толькі аднаго, ды вельмі важнага звяна — у краіне не вялася падрыхтоўка лётнага саставу для грамадзянскай авіяцыі. Цяпер гэты недахоп будзе ліквідаваны. Ужо падчас прыёмнай кампаніі 2021 года адбудзецца першы набор на спецыяльнасць «Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «Інжынер-пілот».

— Прымаючы рашэнне аб адкрыцці новай спецыяльнасці, мы рэалізавалі прапанову Савета Міністраў, падтрыманую кіраўніком нашай дзяржавы. Гэтае рашэнне мае прынцыповае значэнне з пункту погляду забеспячэння суверэнітэту нашай краіны і нацыянальнай бяспекі, — падкрэсліў Ігар Яцкевіч. — Але наборы будуць невялікія. Восем чалавек мы плануем узяць на бюджэтную форму навучання і столькі ж — на платную. Для таго каб паступіць на новую спецыяльнасць, абітурыенты павінны будуць падаць у прыёмную камісію тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання: па беларускай ці рускай мове (на выбар), матэматыцы і англійскай мове.

Ігар Яцкевіч звярнуў увагу на тое, што, акрамя уступных іспытаў, абітурыенты павінны прайсці яшчэ і прафадбор. Ён уключае медыцынскі агляд ва ўрачэбна-лётнай экспертнай камісіі медыцынскай службы грамадзянскай авіяцыі, а таксама іспыты па фізічнай падрыхтоўцы на базе акадэміі. «У тым выпадку, калі на гэтых двух этапах абітурыентам не пашчасціць, яны яшчэ паспеюць падаць свае дакументы ў іншыя ВНУ. Або, калі на руках ёсць чатыры сертыфікаты ЦТ (па адной з дзяржаўных моў, матэматыцы, англійскай мове і фізіцы), у выпадку няўдачы на прафесійным адборы можна паступіць у акадэмію на любую спецыяльнасць інжынерна-тэхнічнага профілю і потым таксама працаваць у авіяцыі», — параіў прарэктар.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў Беларусі 16 чэрвеня. Рэгістрацыя на яго завяршылася 1 чэрвеня. Сваё жаданне паўдзельнічаць у ЦТ афармілі крыху больш як 62 тысячы чалавек. Ахвотных аказалася менш, чым у папярэднім годзе, але арганізатары звязваюць гэту акалічнасць з магчымасцю выкарыстоўваць сертыфікаты ЦТ на працягу двух гадоў.

**Намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ** паведаміла, што тэрмін выдачы пропускаў на ЦТ абітурыентам, якія ў вызначаныя тэрміны запоўнілі электронную анкету і аплацілі рэгістрацыйны ўзнос за ўдзел у ЦТ, але не змаглі іх забраць па прычыне хваробы, вымушанай самаізаляцыі або знаходжання за межамі краіны, быў падоўжаны да 15 чэрвеня.

Самымі запатрабаванымі прадметамі на ЦТ у 2021 годзе стала руская мова (на яе зарэгістраваліся больш як 50 тысяч абітурыентаў) і матэматыка (больш як 32 тысячы). Лідар сярод замежных моў па традыцыі — англійская мова: яе плануюць здаваць больш за 23 тысячы абітурыентаў. А вось тэсты па беларускай мове будуць пісаць менш за 20 тысяч чалавек (і гэта з улікам таго, што некаторыя абітурыенты здаюць і беларускую, і рускую мову, каб выбраць потым для прыёмнай камісіі сертыфікат з больш высокім балам).

> З улікам эпідэмічнай абстаноўкі ЦТ па рускай мове і матэматыцы будзе праходзіць два дні. Усе абітурыенты падзелены на два патокі, таму варта быць уважлівымі і не прапусціць свой дзень здачы тэсціравання, які ўказаны ў пропуску. У іншы дзень абітурыент да здачы экзамену дапушчаны не будзе.

Пры правядзенні ЦТ абавязкова выконваць усе неабходныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні. Яны датычацца ў першую чаргу рассаджвання абітурыентаў — з захаваннем дыстанцыявання не менш за 1 метр. Гэта, вядома, запатрабавала задзейнічаць досыць вялікую колькасць дадатковых аўдыторый.

Арганізатары ЦТ будуць працаваць у масках і пальчатках. «Мы вітаем, калі і абітурыенты будуць таксама выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай абароны. Калі па нейкай прычыне абітурыент забыўся пра іх, але жадае імі скарыстацца, у кожным пункце будзе створаны рэзерв», — адзначыла намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. На пытанне журналіста, ці можа абітурыент падчас экзамену зняць маску, калі яму цяжка дыхаць, яна дала станоўчы адказ.

Прапускны рэжым у пунктах правядзення тэсціравання будзе ажыццяўляцца па дакументах, якія сведчаць асобу: размова ідзе пра пашпарт, від на жыхарства ці пасведчанне бежанца. «Варта зўважыць, што кожны год некаторыя абітурыенты спрабуюць трапіць на экзамен, выкарыстоўваючы пасведчанне кіроўцы ці іншыя дакументы. Яшчэ раз паўтару: усе астатнія дакументы, акрамя трох пералічаных, не з'яўляюцца дакументамі, па якіх можна трапіць на ЦТ», — падкрэсліла Наталля Вайцяховіч.

Арганізатары ЦТ таксама звяртаюць увагу абітурыентаў на неабходнасць захавання дзелавога стылю ў адзенні. Шорты і сланцы лепш пакінуць дома. «ЦТ — экзамен з высокімі стаўкамі, — заўважыла Наталля Вайцяховіч. — Таму ў аўдыторыях павінна захоўвацца дзелавая абстаноўка, якая ў многім залежыць ад знешняга выгляду ўдзельнікаў выпрабавання. У рэшце рэшт, гэта пытанне культуры. А вышэйшая адукацыя, на атрыманне якой прэтэндуюць абітурыенты, — гэта не толькі высокі ўзровень ведаў...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Неабходнасць перамен у адукацыі наспела

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нам трэба высветліць, наколькі папраўкі, што ўносяцца ў Кодэкс аб адукацыі, адказваюць патрэбам сённяшняга дня і што нам трэба рабіць у далейшым для дасягнення гэтай мэты, — адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Ён падкрэсліў, што неабходнасць перамен у адукацыі сапраўды наспела, але гэта не азначае, што трэба адмовіцца ад падыходаў у гэтай сферы, якія на практыцы даказалі сваю эфектыўнасць. Гаворка хутчэй ідзе пра тонкую наладку некаторых важных элементаў айчыннай школы, якая дазволіць ёй больш паспяхова функцыянаваць.

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што вынікам лічбавізацыі эканомікі стала бурная кадравая рэвалюцыя. Многія прафесіі ўжо ў недалёкай будучыні або зусім знікнуць, або іх заменіць штучны інтэлект.

— І калі мы не прымем своечасовых мер, то нашы ВНУ рызыкуюць выпускаць спецыялістаў, якія проста будуць нікому не патрэбны. У прынцыпе ўжо цяпер шматлікія кампаніі самастойна рыхтуюць кадры, таму што гэта хутчэй і танней, чым іх перавучваць, — падкрэсліў спікер.

Ён звярнуў увагу, што сёння нярэдка і настаўнікі, і вучні перагружаныя, а мэтай педагагічнага працэсу становіцца не ўсебаковае раскрыццё асобаснага патэнцыялу, а падрыхтоўка да тэста, бацькі пры гэтым вымушаны прыцягваць рэпетытараў. Засяродзіўся Уладзімір Андрэйчанка і яшчэ на адной праблеме:

— Платай чалавецтва за прагрэс становіцца тое, што ў сучасных падлеткаў, якія значны час праводзяць у інтэрнэце, трансфармуюцца памяць і разумовыя здольнасці, зніжаецца матывацыя да вучобы, развіваецца трывожнасць і ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Таму сучасныя тэхналогіі трэба ўспрымаць не як панацэю, а як інструмент, якім і педагогі, і іх вучні павінны навучыцца правільна карыстацца, каб па-новаму і з карысцю арганізаваць навучальны працэс для ўсіх яго ўдзельнікаў. Напрыклад, мы ўсвядомілі карысць аддаленага навучання, якое выратавала нас падчас пандэміі. Але гэта не павінна стаць нормай пры навучанні ў звыклых умовах.

> **Сёння нярэдка і настаўнікі, і вучні перагружаныя, а мэтай педагагічнага працэсу становіцца не ўсебаковае раскрыццё асобаснага патэнцыялу, а падрыхтоўка да тэста.**

Адвалочнае і пытанне прэстыжу педагагічнай прафесіі, і пытанне аўтарытэту педагога ў грамадстве, якія зніжаюцца. На думку Уладзіміра Андрэйчанкі, адукацыя стала камерцыялізаванай і ўспрымаецца людзьмі выключна як паслуга або тавар. Але ж прафесія педагога патрабуе вялікага самааддачэння, і трэба выкарыстоўваць усе магчымасці, каб вярнуць настаўнікам той высокі статус, які яны на самай справе заслугоўваюць.

Яшчэ адна важная праблема, на якую спікер заклікаў звярнуць пільную ўвагу, — інтэграцыя нацыянальнай сістэмы адукацыі ў сусветную адукацыйную прастору.

— У прынцыпе ў нас дастаткова нядрэнны ўзровень адукацыі. Але мы рыхтуем спецыялістаў, якія пасля завяршэння нашых універсітэтаў часта імкнуцца працягнуць адукацыю, а пасля і працаваць у іншых краінах. Думаецца, што сапраўдная мэта нашага ўдзелу ў Балонскім працэсе, праграмах па абмене студэнтамі і іншых мерапрыемствах такога роду павінна быць у тым, каб менавіта нашы навучальныя ўстановы станавіліся ўсё больш прывабнымі для замежнікаў. Толькі так мы зможам павысіць свае стаўкі ў барацьбе за кантроль над інтэлектуальнымі рэсурсамі, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

## ЭКЗАМЕН ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ МОЖА СТАЦЬ АБАВЯЗКОВЫМ ПРЫ ПАСТУПЛЕННІ Ў ВНУ

Такую прапанову выказаў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

— Улічваючы важнасць гістарычных ведаў у фарміраванні светапогляду падрастаючага пакалення, Міністэрства адукацыі ініцыіруе ўключэнне экзамену па гісторыі Беларусі як абавязковага пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі, — сказаў ён.

Міністр адзначыў, што нацыянальная сістэма адукацыі адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляе да яе грамадства і дзяржава. Захоўваюцца і будуць заставацца нязменнымі асноўныя прынцыпы: дзяржаўная падтрымка, справядлівасць і роўны доступ да якаснай адукацыі, мэтавы набор, гарантыя першага працоўнага месца. Рэалізоўваецца таксама найважнейшы прынцып «адукацыя праз усё жыццё». Па паказчыках у сферы адукацыі Беларусь трывала замацавалася ў групе найбольш развітых краін. Аб прэстыжнасці і якасці адукацыі сведчыць і рост экспарту адукацыйных паслуг: больш за 27 тысяч замежных грамадзян з 109 краін выбралі для сябе навучанне ва ўстановах адукацыі нашай краіны.

## ЦЯЖКАСЦІ З КВАЛІФІКАВАНЫМІ І ІНІЦЫЯТЫЎНЫМІ КАДРАМІ

Пра выкарыстанне новых форм навучання і ўдасканаленне адукацыйнага працэсу расказаў **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ.**

— У складанай эпідэміялагічнай абстаноўцы больш за 90 % ВНУ Беларусі выкарыстоўваюць дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі, у тым ліку ў дзённай форме атрымання адукацыі. Наш вопыт паказвае, што для ўвядзення дыстанцыйнай формы як самастойнай формы атрымання вышэйшай адукацыі нароўні з завочнай і вочнай адукацыяй, што прадугледжана новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі, ужо сфарміравана неабходная тэхналагічная і метадычная база.

**Генеральны дырэктар ААТ «Мінскі трактарны завод» Віталь ВОЎК** расказаў пра ўзаемадзеянне прадпрыемства з установамі адукацыі. Ён адзначыў, што за апошнія пяць гадоў тысячы студэнтаў ВНУ і навучэнцаў прафесійна-тэхнічных устаноў прайшлі тут вытворчую практыку. Больш за 350 маладых спецыялістаў штогод прыходзяць працаваць на МТЗ. Аднак гэтага недастаткова, і кожны год прадпрыемства адчувае цяжкасці з кваліфікаванымі і ініцыятыўнымі маладымі работнікамі. Звярнуўся кіраўнік МТЗ і да праблемы матэрыяльна-тэхнічнай базы сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў, адзначыўшы, што прадпрыемствы пераасначшаюцца хутчэй, чым навучальныя ўстановы. За апошнія тры гады МТЗ пастаравіў установам адукацыі больш за 70 адзінак сваёй новай тэхнікі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# НеЧарнобыль...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Новыя сучасныя аб'екты павінны з'явіцца ў сферы аграпрамысловага комплексу, падкрэсліў губернатар. У адным з раёнаў плануюць пабудаваць рабатызаваны комплекс, у іншых — новыя фермы, даільныя малочныя блокі. Адзін з найважнейшых кірункаў сацыяльных гарантый для людзей, безумоўна, — развіццё сістэмы аховы здароўя. Сярод канкрэтных задач — завяршэнне рамонтных работ у хірургічным корпусе Хойніцкай ЦРБ, рамонт тэрапеўтычнага корпуса. У праграме ўдзелена ўвага аб'ектам аховы здароўя ў кожным з раёнаў: ад грунтоўных рамонтных работ у будынках да тэхнічнага пераабсталявання.

Акрамя таго, пастаўлена задача вызначыць у раёнах па шэсць буйных населеных пунктаў, па развіццё тэрыторыі якіх будуць накіраваны асноўныя рэсурсы. Усё нацэлена на тое, каб удасканаліць інфраструктуру, вытворчасць, неабходныя сацыяльна значныя кірункі. Таксама кіраўніцтва рэгіёна абмеркавала працяг комплексу мер па радыяцыйнай абароне, развіцці лесааднаўлення, меліярацыі тэрыторыі і землеўпарадкаванні.

Генадзь Салавей падкрэсліў, што пры фарміраванні праекта новай праграмы неабходна канкрэтызаваць мерапрыемствы, выпрацаваць выразную дарожную карту, па якой далей працаваць у кожным з абраных раёнаў.

— Дзяржава ўкладала і ўкладвае нямала ў развіццё пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС тэрыторый, але патрэбна аддача, — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай Рагашчук, у сваю чаргу, звярнуў увагу, што пры фарміраванні праграмы важна ўлічыць і магчымасці, рэсурсы той ці іншай тэрыторыі, арганізацыі, структуры. Старшыня камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Ігар Аслюк падкрэсліў, што зараз уносяцца прапановы па прэферэнцыях для суб'ектаў гаспадарання, якія плануюць развівацца і будавацца на дадзеных тэрыторыях. Задача — максімальна збалансаваць выгадныя ўмовы для суб'ектаў усіх формаў уласнасці.

Паралельна ў рэгіёне працягваецца работа па рэалізацыі зацверджанай Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2021—2025 гады. Сярод асноўных мэт праграмы — безумоўнае забеспячэнне патрабаванняў радыяцыйнай бяспекі і паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё, адраджэнне забруджаных тэрыторый. Важным пытаннем таксама застаецца прыцягненне (пад строгім кантролем вучоных) земляў у гаспадарчы абарот.



Фота Віктара МАРОЗ.

Дырэктар фермерскай гаспадаркі з патрыятычнай назвай «Родны шлях» Мікалай ЧУБЯНОК.

## Родны шлях як адказны выбар

Цікава, як перспектыўныя кірункі адраджэння чарнобыльскіх земляў, што разглядаюцца на самым высокім узроўні, перакліkаюцца з работай і жыццём людзей непасрэдна ў раёнах Гомельшчыны, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Менавіта гэтаму аспекту «Звязда» прысвячае свой новы праект «НеЧарнобыль». Герой сённяшняга матэрыялу — удзельнік VI Усебеларускага народнага сходу. Ён прадстаўляў бізнес Гомельшчыны. Гэта дэлегат ад Хойніцкага раёна **Мікалай ЧУБЯНОК — дэпутат Стралічаўскага сельскага Савета, дырэктар фермерскай гаспадаркі з патрыятычнай назвай «Родны шлях».** Больш чым дзесяць гадоў таму былы мінчанін прамяняў сталіцу на Хойнікі, сваю малую радзіму, з якой у дзяцінстве іх разлучыў Чарнобыль.

— Мы з'ехалі пасля аварыі на ЧАЭС у Смалявічы, там скончыў школу. Потым сустрэў сваё каханне ў Мінску. Аказалася, мая Алена, будучая на той момант жонка, як і я, родам з Хойнікаў. Ажаніліся і жылі ў сталіцы, а потым вырашылі вярнуцца ў родныя мясціны.

Сёння Мікалай Чубянок і яго «Родны шлях» вядзе на Хойнікшчыне паспяховую вытворчасць, забяспечвае сваім работнікам належную зарплату. Але яго гісторыя — гэта яшчэ і прыклад таго, як ацэньваецца самаадданая праца на складанай чарнобыльскай зямлі, як заслугоўваецца давер людзей і мясцовых улад, якія аказваюць дапамогу і гатовыя падтрымаць.

— Пачыналі мы з фірмы па продажы частак на грузавую спецтэхніку. У 2014 годзе раённыя ўлады прапанавалі адкрыць фермерскую гаспадарку. Нам выдзелілі ў бясплатную арэнду на 25 гадоў памяшканні былой малочнатаварнай фермы ў вёсцы Губарэвічы, што на тэрыторыі Стралічаўскага сельскага Савета. Асноўная ўмова — стварэнне рабочых месцаў, мы яе выканалі, — тлумачыць Мікалай Чубянок.

Але перш чым завесці свой статак, давялося нямала папрацаваць на разбітых ушчэнт кароўніках і падсобных памяшканнях: комплекс збудаванняў былой фермы некалькі гадоў не эксплуатаваўся, і ад яго, па сутнасці, засталіся толькі сцены. Паступова ўсё прывялі да ладу, адрамантавалі ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучасных тэхналогій жывёлагадоўлі. Кароў набывалі ў людзей, закупілі малакаправод і ўсё неабходнае абсталяванне. На працягу двух з паловай года атрымлівалі малако класа «экстра». З часам змянілі стратэгію, вырашылі больш актыўна развіваць раслінаводства, каб у першую чаргу быць са сваімі кармамі. Прадалі ўсю жывёлу, каб набыць тэхніку.

— Пасля звароту на «прамую лінію» да губернатара нам выдзелілі зямлю, на якой мы другі год ужо вырошчваем уласныя кармы — кукурузу, збожжавыя і бабовыя, — поўнасцю забяспечваем свой новы ўжо статак, — дзеліцца фермер і распавядае, як рады магчымасці апрацоўваць, сеяць, прыбіраць ураджай. Пад пасадкі культур адведзена 1300 гектараў. А вось тое, што мясцовыя ўлады падтрымліваюць намаганні фермера і пры неабходнасці аказваюць яму дапамогу, дае стымул развівацца далей, але, безумоўна, нясе і павышаную адказнасць.

Між тым малако, якое даюць каровы хойніцкага фермера, чыстае і праходзіць усе кантрольныя пробы. Праходзяць адпаведныя даследаванні і ўсе кармы для жывёлы.

— Доім малакаправодам, па якім малако паступае ў халадзільную ўстаноўку і пры гэтым не кантактуе са знешнім асяроддзем. Рэалізоўваем малако на Палескі вытворчы ўчастак ААТ «Мілкавіта». Што датычыцца якасці малака — толькі гатункам «экстра». Увогуле, працаваць цяпер проста ідэальна: раніцай малако здаём, пасля абеду грошы на рахунку. Не горш чым у Германіі. Калісь марыў, каб так працавалі, зайздросціў нямецкім фермерам, за вопытам работы якіх удалося паназіраць, — матывуе Мікалай Валянцінавіч.

Вытворчасць малака — асноўны, але не адзіны кірунак дзейнасці «Роднага шляху». Аказваюць транспартныя паслугі сельгаспрадпрыемствам на жніве, падчас нарыхтоўкі кармоў.

## Гастарбайтары — назад да сем'яў

Сёння ў фермерскай гаспадарцы Чубянка працуе 25 чалавек. Фактаў парушэння дысцыпліны няма наогул. Нягледзячы на неабходнасць укладання значных сродкаў у развіццё сельгасвытворчасці, на зарплаце работнікаў фермер не эканоміць.

— Адзначу, што калектыў у нас падабраўся вельмі добры. Дарэчы, 90 % нашых работнікаў — былыя гастарбайтары: многім давялося ездзіць працаваць на будоўлі ў суседнюю краіну. Мы здолелі іх зацікавіць і замацаваць тут, на радзіме. Вярнуліся назад да сем'яў і, кажуць, вельмі шчаслівыя, — зазначае Мікалай Чубянок. — Між тым у нас ёсць дамоўленасць з кіраўнікамі гаспадарак у раёне — не пераманьваць спецыялістаў. Навучаем, выхоўваем сваіх, бо кадры, вядома, — гэта ўсё! Сваіх работнікаў прывозім на работу з найбліжэйшых вёсак і горада. Я выдатна разумею, што праца на зямлі складаная, таму выхадны ў нядзелю — жалезны закон. Ёсць у нас і свая сістэма стымулявання работнікаў.

Дзеліцца Мікалай Валянцінавіч і сваім меркаваннем пра тое, што неабходна, каб людзі заставаліся жыць і будавалі сем'і на вёсцы.

— Безумоўна, галоўнае — развіццё інфраструктуры. Мяркую, гэты фактар уплывае на тое, што людзі імкнуцца пасяліцца бліжэй да горада. Самае каштоўнае на вёсцы — гэта працавітыя, сумленныя ў рабоце людзі, якія павінны быць упэўнены, што і ў глыбінцы будзе месца для працы, — упэўнены фермер. І ўсё ж ён лічыць родную Хойнікшчыну вельмі папулярнай сярод пачынаючых прадпрымальнікаў.

— Ніхто не спяшаецца ў Мінск ці Гомель, наадварот, маладыя хлопцы адкрываюць свае фермерскія гаспадаркі, прыязджаюць да мяне пераймаць вопыт, просяць дапамагчы тэхнікай. У гэтым кірунку таксама ёсць над чым папрацаваць. Трэба пашыраць і выпрацоўваць новыя падыходы крэдытнай палітыкі дзяржбанкаў, бо фермерам-пачаткоўцам у глыбінцы вельмі складана, — лічыць хойніцкі фермер. Гэтую думку ён абгрунтоўваў падчас падрыхтоўкі прапаноў да абмеркавання на Усебеларускім народным сходзе. — Для фермерскіх гаспадарак вельмі важна мець пачатковую фінансавую падушку, далей яны самі будуць развівацца і выкарыстоўваць ужо ўласныя сродкі для афармлення якіх-небудзь пазык, затое зямля будзе «працаваць» і даваць працоўныя месцы людзям у раёне.

Сам жа кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Родны шлях» цяпер прыкладае ўсе сілы, каб павялічыць пагалоўе жывёлы.

— Кіраўніцтва раёна і вобласці прапрацоўвае пытанне, каб ужо сёлета даць нам у давернае кіраванне КСУП «Арэвічы», якое, на жаль, сёння на апошніх месцах у раёне. У гаспадарцы 3,5 тысячы галоў дойнага стада. Ужо зараз мы актыўна працуем з МТФ, рыхтуем людзей да работы. План на бягучы год — адрамантаваць усе памяшканні МТФ у Губарэвічах, дзе размешчана наша пагалоўе. Вельмі шмат работы — толькі не лянуйся!

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Жыццялюбаў паболее

### З будаўніцтвам новага буйнога прадпрыемства ў Любанскі раён прыедзе прыкладна каля дзвюх тысяч навасёлаў — маладзі, спецыялістаў з сем'ямі, дзецьмі

**Як вядома, на поўдні Міншчыны працягваецца будаўніцтва Нежынскага горна-абагачальнага камбіната. Плануецца, што з яго ўводам у дзеянне колькасць жыхароў Любані павялічыцца на шэсць тысяч, а ў перспектыве дасягне амаль трыццаці тысяч чалавек. Бясспрэчна, дзеючая сацыяльная і інжынерная інфраструктура не разлічана на столькі насельніцтва. Што робіцца ў горадзе для стварэння камфортных умоў пражывання, забеспячэння жыццядзейнасці людзей у перспектыве? Як паўплывала будаўніцтва горна-абагачальнага камбіната на жыццё Любаншчыны і яе жыхароў? Пра гэта і расказаў «Звяздзе» старшыня Любанскага райвыканкама Валерый МЕЛЬНІК:**

— У Любані «Слаўкалій» рэалізоўвае адзін з самых буйных інвестыцыйных праектаў — будаўніцтва горна-абагачальнага комплексу. На сёння гатоўнасць аб'екта складае каля 80 %. У 2023 годзе плануецца выдаць першую прадукцыю. Канешне, у горадзе ўдзяляецца значная ўвага стварэнню адпаведнай інфраструктуры для камфортнага пражывання людзей. «Слаўкалій» пабудаваў тры дамы. Адзін 40-кватэрны перадалі ў структуру раёна для забеспячэння жыллём настаўнікаў, урачоў, маладых спецыялістаў. Два іншыя пакінулі для сваіх патрэб, каб прыцягнуць на камбінат працоўныя рэсурсы: маладых спецыялістаў, шахцёраў, інжынерна-тэхнічных работнікаў. Акрамя таго, узводзяцца яшчэ два жылыя дамы. Мяркую, да канца гэтага года або да пачатку наступнага яны будуць здадзены.

Адначасова рамантуюцца аб'екты інфраструктуры, пад'язныя шляхі, асфальтуюцца вуліцы, добраўпарадкоўваецца горад. Будуецца пажарнае дэпо для таго, каб стварыць бяспеку рудаўпраўлення, у тым ліку і нашых населеных пунктаў, жыхароў.

Мяркуецца, што ў раён прыедзе прыкладна каля дзвюх тысяч навасёлаў — маладзі, спецыялістаў з сем'ямі, дзецьмі. Дзіцячыя сады Любані перапоўнены. Таму пачалі ўзводзіць новую дзіцячую дашкольную ўстанову.

Мы разумеем, што людзі павінны не толькі працаваць, але і адпачываць, задавальняць спажывецкія патрэбнасці. У горадзе адкрылі новы гандлёвы цэнтр «Буш-Вясёлка», які цяпер перайменаваны ў «Еўрасетку». Плануецца павялічыць і магутнасці цэнтральнай раённай бальніцы, закупіць новае сучаснае абсталяванне.



У нас узводзіцца завод цяжкага машынабудавання, які плануем увесці ў дзеянне праз год-паўтара. Прадпрыемства будзе забяспечваць камбінат машынамі, механізмамі.

Думаем мы і над тым, каб яшчэ са школы рыхтаваць вучняў да працы на будучым гіганце. Сюды прыязджаюць прадстаўнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў, навукоўцы, спецыялісты «Беларуськалія», каб скіраваць маладых людзей на выбар у асноўным спецыяльнасцяў тэхнічнага кірунку, якія будуць запатрабаваны на горна-абагачальным камбінаце. Кіраўніцтва «Слаўкалія» запэўнівае, што пасля заканчэння вучобы іх працаўладкуюць. Словам, моладзь трэба навучаць, каб вярталася ў свой родны горад і працавала на малой радзіме, стварала сем'і. Бо моладзь — гэта будучыня, а значыць, гарантыя таго, што Любанскі край будзе развівацца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Электронная краіна

# «Воблака» для дзяржаўных арганізацый

**У Віцебскім аблвыканкаме адбыўся семінар, прысвечаны лічбавізацыі дзяржаўных органаў і арганізацый з прымяненнем дзеючага заканадаўства. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і воблачны аператар beCloud.**

Віцебск стаў пятым абласным цэнтрам, дзе прайшлі мерапрыемствы па прэзентацыі воблачных рашэнняў і знаёмстве з заканадаўчымі аспектамі ІКТ-дзейнасці. Аналагічныя семінары ўжо адбыліся ў Гомельскай, Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.

У рамках семінара быў прадстаўлены праект «Нацыянальная SMART-платформа», аператарам якой з'яўляецца beCloud. Платформа прапануе рашэнні і інфраструктуру для рэалізацыі «разумных» праектаў, ае распрацоўшчыкі кажуць пра вялікія магчымасці для развіцця рэгіёна, якія яна дае.

У размове з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі **Алег СЯДЗЕЛЬНІК, генеральны дырэктар СТАА «Беларускія воблачныя тэхналогіі»**, расказаў пра тое, што ў выніку стварэння «дзяржаўнага воблака» органы ўлады і арганізацыі могуць працаваць больш эфектыўна, эканомяцца бюджэтныя сродкі; інфармацыя, у тым ліку персанальная, надзейна абараняецца. А такія семінары, заўважыў ён, дазваляюць быць бліжэй да спажыўцоў.

**Канстанцін БУЛАТАЎ, начальнік аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці,** пацвердзіў журналістам перавагі выкарыстання «лічбы». Актыўнае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій, па яго словах, спрыяе павышэнню якасці расследавання злачынстваў, эканоміць час і фінансавыя выдаткі. Чарговы этап — пераход ад папяровых носьбітаў да практыкі электроннага занясення інфармацыі. Надзейная сістэма бяспекі гарантуе абарону ад несанкцыянаванага доступу ў базу даных.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Государственному предприятию «Гостиничный комплекс «Юбилейный»**
**(Продавец)**

**Лот № 1: оборудование для боулинга в к-те Китай, инв. № 0000003242 (полный перечень комплекта на сайте ino.by).**
Местонахождение: г. Минск, пр-т Победителей, д. 19.
Начальная цена с НДС – 19 621,83 руб.

**Аукцион состоится 01.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 191021390

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «МИНСКАЯ ПЕЧАТНАЯ ФАБРИКА» ГОЗНАКА**
**(Продавец)**

Лот № 1, состав:
1. Легковой джип MAZDA CX7, кузов (рама) № JMZER893800133080;
2. - Комплект автошин летних модель Matador MP 85 Hectorra 4x4 235/60 R18 (4 шт.) б/у; - Комплект дисков колесных Dezent F 7.5x18 (4 шт.) б/у.
Местонахождение: г. Минск, ул. Володарского, д. 3.
Начальная цена с НДС – 9508,19 руб.

**Аукцион состоится 14.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 191021390

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды сроком 3 года части помещения площадью 5,16 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37.
Размер ежемесячной арендной платы: 5 базовых арендных величин.
Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – размещение рекламных настенных конструкций.
Начальная цена продажи объекта – 21,80 руб. (двадцать один рубль восемьдесят копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2,18 руб. (два рубля восемнадцать копеек)

**Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70**

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды,
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 июля 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

**Последний день приема заявлений – 08 июля 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 410/С-28262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – забор), общей площадью 702,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е, забор;
- капитальное строение, инв. № 410/С-28181 (назначение – 2 29 08 здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад кирпичный), общей площадью 814,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/2;
- капитальное строение, инв. № 410/С-22461 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – закрытая терраса для хранения велосипедов), общей площадью 452,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/1;
- капитальное строение, инв. № 410/С-28180 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар), общей площадью 34,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е.
Лот № 1 находится на земельном участке, кадастровый № 420850100001010312, площадью 0,4519 га (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е.

Начальная цена продажи – 153 120 руб. (сто пятьдесят три тысячи сто двадцать рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 15 312 руб. (пятнадцать тысяч триста двенадцать рублей)

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Волковысский филиал), 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 13 июля 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 09 июля 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**
**22 июля 2021 года проводит 14-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 158 | Автоцистерна АЦ-8-5334 с/о А8310030 на МАЗ-5334 ш. 46422 дв. 624410 1982 г. *4 кат. 29 898 км 234, 45 м/ч* | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 19 800,00 | 3 960,00 |
| 159 | Грузовой бортовой Урал-4320 ш. 011912 дв. 401969 1982 г. *4 кат. 89 139 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 160 | Грузовой бортовой Урал-432000-01 ш. L0157764 дв. 671608 1990 г. *4 кат. 73 832 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 161 | Грузовой бортовой Урал-43202-0011 ш. 0095181 дв. 235122 1988 г. *4 кат. 91 112 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 162 | Грузовой бортовой Урал-432020-01 ш. L0145354 дв. 585523 1990 г. *4 кат. 58 498 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 200.00 | 1 840,00 |
| 163 | Грузовой бортовой Урал-43202-0011-01 ш. 131405 дв. 164320 1989 г. *4 кат. 47 093 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 500,00 | 1 900,00 |
| 164 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105 ш. 003734 дв. 763351 1985 г. *4 кат. 10 6420 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000,00 | 2 000,00 |
| 165 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106 ш. L0004867 дв. 0668874 1990 г. *3 кат. 93 980 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000,00 | 2 000,00 |
| 166 | Грузовой бортовой КрАЗ-255Б1 ш. L0684630 дв. 28715 1990 г. *4 кат. 27 146 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 7 000,00 | 1 400,00 |
| 167 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 510345 дв. 890376 1984 г. *4 кат. 1560 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000.00 | 2 000,00 |
| 168 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. М0706298 дв. 15272 1991 г. *4 кат. 35 277 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 500,00 | 1 900,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 22 июля 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 19 июля 2021 года.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **22 июля 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел./факсу (017) 319 35 41. Извещение опубликовано на сайтах http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, тел. + 375 29 688-04-88** |

**Предмет аукциона – транспортные средства, бывшие в употреблении**

**Автомобиль «Мерседес-Бенц» SL 500**
(легковой кабриолет, рег. знак 9717 ЕС-7, 2002 года выпуска)

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 16 005,60 белорусского рубля**
**Шаг аукциона – 800,28 белорусского рубля**

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию, +375 44-704-92-06 (Кравченя Татьяна Николаевна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 4 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.07.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 11.06.2021 до 17.00 12.07.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
11 чэрвеня 2021 г. № 22 (607)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

# ТЭРЫТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ САВЕТАЎ



Фота БелТА.

**Адбылося выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі, падчас якога разглядалі эфектыўнасць і вынікі работы Мінскага райвыканкама, Мінскага раённага Савета дэпутатаў са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у 2020 годзе і за пяць месяцаў 2021 года.**

## Майстар-клас ад сенатараў

Пасяджэнню папярэднічала грунтоўная падрыхтоўка. У апараце Савета Рэспублікі пастаянна вывучаюць пошту, змест скаргаў, статыстыку, рэгіянальныя асаблівасці і характар зваротаў грамадзян. Такі аналіз і падказаў адрас правядзення пасяджэння — Мінскі раён. Ён прысталічны. І ў гэтым яго вялікая своеасаблівасць і спецыфіка ў параўнанні з іншымі раёнамі краіны. Тут высокая шчыльнасць насельніцтва.

— На тэрыторыі Мінскага раёна пражываюць амаль 260 тысяч чалавек, многія з іх працуюць у Мінску. Сумарная плошча яго — 360 населеных пунктаў — больш чым у тры разы пераўзыходзіць тэрыторыю сталіцы. Адсюль і шмат праблем, пра якія ў сваіх зваротах паведамляюць жыхары раёна, — лічыць **старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір ЮРГЕВІЧ.**

стар. 8

VIII ФОРУМ РЭГІЁНАЎ

# У АБЛАСЦЯХ РЫХТУЮЦЬ КАНТРАКТЫ




## Да пачатку VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі засталося зусім мала часу. Падрыхтоўка ўступіла ў завяршальную стадыю

**Форум, нагадаем, пройдзе ў Маскве і Маскоўскай вобласці з 29 чэрвеня да 1 ліпеня пад эгідай Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі. Па папярэдніх звестках, у рабоце форуму, дакладней, у яго пленарным пасяджэнні 1 ліпеня, прымуць удзел прэзідэнты абедзвюх дзяржаў. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў форуму стане навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва ў эпоху лічбавізацыі.**

На нядаўняй нарадзе ў Савеце Рэспублікі была яшчэ раз удакладнена праграма форуму, разгледжаны яе вузлавыя пункты, абмеркаваны спіс і склад дэлегацый, вызначана кола асноўных прамоўцаў. Члены арганізацыйнага камітэта, сенатары і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, запрошаныя прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, зацікаўленых арганізацый пагадзіліся з тым, што работа будзе праходзіць у некалькіх профільных секцыях.

У рэжыме відэаканферэнцыі ў студыях абласных цэнтраў прысутнічалі старшыні аблвыканкамаў і абласных Саветаў дэпутатаў. У дэлегацый беларускіх рэгіёнаў асаблівая і пачэсная задача: перайсці ў супрацоўніцтве з расійскімі калегамі на якасна новы ўзровень, знайсці дадатковыя рынкі збыту прадукцыі. А гэта рэальна. У абласцях Беларусі працягваецца работа над кантрактамі для падпісання. Некаторыя з іх ужо заключаны ў рамках падрыхтоўкі да форуму. І сапраўды, навошта цягнуць, калі ёсць магчымасць пачаць рэалізацыю дамоўленасцяў ужо цяпер, бо час — гэта грошы.

На эканамічным фоне пройдзе і сустрэча спікераў верхніх палат беларускага і расійскага парламентаў Наталлі Качанавай і Валянціны Мацвіенкі з кіраўнікамі абласцей дзвюх краін. Там мяркуецца падпісаць шэраг важных пагадненняў, накіраваных на паглыбленне менавіта рэгіянальных сувязяў. Ад беларускіх рэгіёнаў рыхтуецца больш за дваццаць такіх дакументаў. Напрыклад, Віцебская вобласць прывязе ў Маскву пяць праектаў пагадненняў, Мінская і Магілёўская — па чатыры, Гродзенская — тры і г. д. Зараз увогуле вядзецца работа над фармалізацыяй 58 дамоўленасцяў аб супрацоўніцтве, з іх поўнасцю гатовыя да заключэння 17 пагадненняў.

Запланавана сумеснае пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва дэлегацый Беларускай і Расійскай гандлёва-прамысловых палат. Размова пойдзе аб далейшым паглыбленні эканамічнай інтэграцыі ў межах Саюзнай дзяржавы. Мяркуецца таксама падпісанне ўзаемавыгадных пагадненняў і камерцыйных кантрактаў паміж прадпрыемствамі. Увогуле, ёсць усе шанцы заключыць на форуме кантракты на агульную суму ў 700 мільёнаў долараў. Але пры ўдалай рабоце дэлегацый рэгіёнаў можна разлічваць і на больш важкую лічбу — 900 мільёнаў.

Форум будзе праходзіць у гібрыдным фармаце: адна частка мерапрыемстваў — у анлайн-рэжыме, другая — у вочным.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ПЕРСПЕКТЫВЫ ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з паслом Казахстана ў Беларусі Аскарам Бейсенбаевым.**

У размове сенатар адзначыла высокі ўзровень палітычнага дыялогу паміж нашымі краінамі ў розных сферах дзейнасці. Таксама цеснае ўзаемадзеянне наладжана і паміж урадамі Беларусі і Казахстана — цяпер на самым высокім узроўні абмяркоўваецца дарожная карта супрацоўніцтва. Паводле слоў Наталлі Качанавай, у краін ёсць перспектывы абсалютна па ўсіх напрамках.

Аскар Бейсенбаеў адзначыў, што ў Казахстане вельмі цёпла ставяцца да Беларусі і беларусаў. З кожным годам расце колькасць тавараў з Беларусі, мацнеюць сувязі паміж бізнесменамі. Многія з іх адкрываюць для сябе Беларусь. Пасол сказаў, што Казахстан і Беларусь — стратэгічныя партнёры, і аснову гэтаму заклалі дружалюбныя адносіны нашых прэзідэнтаў.

# ПРА МАГЧЫМАСЦІ І ТУПІКІ

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін БДУ Андрэй РУСАКОВІЧ выступіў падчас круглага стала.**

Тэма выступлення: «Знешняя палітыка Беларусі: тэарэтычныя магчымасці і практычныя тупікі на еўрапейскім напрамку. Досвед сітуацыйнага аналізу». Сенатар разгледзеў праблематыку асноўных напрамкаў знешняй палітыкі нашай краіны ў сучасных умовах. Акцэнт быў зроблены на асаблівасцях адносін Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам.

Круглы стол быў арганізаваны Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам пры ўдзеле Інстытута Еўропы РАН і Расійскай асацыяцыі прыбалтыйскіх даследаванняў.

# СУЗДАЛЬСКІЯ СУСТРЭЧЫ

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, а таксама член камісіі Парламенцкага Сходу (ПС) Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Анатоль ШЧАСНЫ ўзяў удзел у пасяджэнні гэтай камісіі ў Суздалі.**

Парламентарыі абмеркавалі выкананне бюджэту Саюзнай дзяржавы ў 2021 годзе, фарміраванне яго праекта на наступны год, падрыхтоўку чарговых мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы. Таксама былі разгледжаны вынікі пасяджэння пастаянна дзеючага пры ПС семінара па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы.

Адбылася сустрэча саюзных парламентарыяў з прадстаўнікамі адміністрацыі Уладзімірскай вобласці, дзе быў абмеркаваны шэраг актуальных пытанняў развіцця далейшага ўзаемадзеяння рэгіёнаў.

# НАДЗЕЙНЫЯ «СУВЯЗНЫЯ»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ сустрэўся ў Расонах з прадстаўнікамі мясцовага дэпутацкага корпуса, старшынямі гарадскога і сельскіх выканаўчых камітэтаў.**

У час размовы парламентарый, у прыватнасці, сказаў, што сёння вельмі многае залежыць ад дзейнасці дэпутатаў. Яны, на яго погляд, ажыццяўляюць надзейную сувязь паміж дзяржавай і жыхарамі сваёй акругі.

У ходзе сустрэчы быў выказаны шэраг прапаноў па ўдасканаленні работы дэпутацкага корпуса, намечаны шляхі іх рэалізацыі.

# ТЭРЫТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ САВЕТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Напярэдадні пасяджэння члены прэзідыума спецыяльна правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у асобных сельскіх выканкамах раёна. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава прымала наведвальнікаў у Бараўлянскім сельскім выканкаме, яе намеснік Анатоль Ісачанка — у Заслаўскім гарадскім выканкаме, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец — у Мачулішчынскім пасялковым выканкаме, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў — у Сеніцкім сельскім выканкаме. Была атрымана аператыўная і актуальная інфармацыя менавіта па тэме пасяджэння. У пэўным сэнсе гэта быў майстар-клас ад сенатараў.


Фота БелТА.

> Ад таго, як складваецца работа са зваротамі грамадзян на месцах, залежыць стаўленне людзей да ўлады ў цэлым.

Зразумела, вынікі адзінага дня таксама былі ўважліва прааналізаваны, абагульнены і выкарыстоўваліся ў ходзе работы пасяджэння, у якім разам з сенатарамі ўзялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, абласнога, раённага і сельскіх Саветаў дэпутатаў, кіраўнікі прадпрыемстваў і гаспадарак, а таксама прадстаўнікі ўпраўленняў райвыканкама і раённых службаў. Адну з высноў гэтага аналізу агучыла Наталля Качанава: прыкладна 70 працэнтаў зваротаў грамадзян маглі быць вырашаны мясцовай уладай раёна самастойна, без удзелу вышэйстаячых інстанцый. Дык чаму нярэдка па дробнай праблеме жыхары пасёлкаў звяртаюцца, скажам, у Савет Рэспублікі?

Адказ дала Наталля Качанава: прычына — у няўменні ці нежаданні асобных кіраўнікоў уважліва працаваць з людзьмі. А чалавек — галоўнае. Трэба ўмець слухаць і чуць чалавека. У гэтым поспех працы любога кіраўніка на любым узроўні. Бо ад таго, як складваецца работа са зваротамі грамадзян на месцах, залежыць стаўленне людзей да ўлады ў цэлым. І аб яе эфектыўнасці нярэдка мяркуюць па тым, як працуе мясцовая жыллёва-камунальная гаспадарка, якая вада ў кране, якія вуліцы, дарогі, дахі дамоў і аўтобусныя маршруты, сказала старшыня Савета Рэспублікі.

## Запыт на крэатыўных

Зразумела, што істотна скарацiць колькасць зваротаў можна толькі ў выніку ліквідацыі прычын, якія вымушаюць людзей пісаць у інстанцыі, тэлефанаваць на прамыя лініі, дасылаць электронныя меседжы. Падчас размовы спікер верхняй палаты парламента неаднойчы звярталася ўвагу прысутных на жыццёвую неабходнасць актывізацыі дэпутацкага корпуса ў раёне і сельсаветаў у барацьбе з прычынамі зваротаў. У гэтым сэнсе выступленне старшыні Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юліі Бялянкінай было, як гаворыцца, у тэму. Яна паведаміла аб тым, як забяспечваецца разгляд зваротаў грамадзян у райсавеце, як ажыццяўляецца з гэтай нагоды ўзаемадзеянне з іншымі дзяржаўнымі органамі, структурамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі, аб'яднаннямі.

У час размовы ўзнікла пытанне аб пэўных нюансах сумяшчэння працоўных абавязкаў кіраўніка і абавязкаў дэпутацкіх: ці не замінаюць яны адзін аднаму? Бо і першае, і другое патрабуе намаганняў, а грамадская работа адымае нямала часу. Паводле слоў дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Водаканал Мінскага раёна», дэпутата Мінскага раённага Савета Дзмітрыя Дразда, дзейнасць у райсавеце не перашкаджае выкананню яго службовых абавязкаў.

> Прыкладна 70 працэнтаў зваротаў грамадзян маглі быць вырашаны мясцовай уладай раёна самастойна, без удзелу вышэйстаячых інстанцый.

Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая ў сваім даволі эмацыянальным выступленні адзначыла, што ў вобласці народныя абраннікі Саветаў усіх узроўняў нацэлены на неафармальную работу з насельніцтвам. Актыўна практыкуецца выезд на месца для разгляду зваротаў, бо яны — зона адказнасці Саветаў. І гэта дае плён. Пасля пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі будуць зроблены высновы.

У заключным слове Наталля Качанава заклікала дэпутацкі корпус Беларусі, а гэта 18 100 чалавек, больш крэатыўна, рашуча і смела праяўляць сабе справамі. З яе пункту гледжання сёння павінна яшчэ больш ініцыятыў зыходзіць ад дэпутатаў, якія бліжэй за ўсё да людзей. Трэба іх больш інфармаваць аб працы на месцах, аб тым, як вырашаюцца праблемы, пра якія сігналізуюць людзі. Тады будзе менш пытанняў ад насельніцтва і спекуляцый. Увогуле роля дэпутацкага корпуса можа быць больш знакавай, і ў рабоце са зваротамі грамадзян — таксама, — сказала спікер.

А што датычыцца дадзенага пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі, то, паводле яе слоў, гэта толькі пачатак. Такую форму работы трэба практыкаваць і ў іншых раёнах нашай краіны і яе сталіцы, падкрэсліла Наталля Качанава.

**Леанід ТУГАРЫН.**

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

# «ЗОРНАЕ ВОКА» НЕ ПАДМАНЕШ

## Ад запалак да спадарожнікавага маніторынгу, або бізнес на Віцебшчыне

**У Падзвінні зарэгістравана каля 23,6 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў і 8,2 тысячы арганізацый малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Летась доля бізнесу ў аб'ёме паступленняў у бюджэт вобласці склала 22,3 % (прыкладна 425,6 мільёна рублёў).**

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг перавысіла 8,3 мільёна рублёў, або 26,7 % ад усяго выручанага.

Паводле інфармацыі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці, каля 40 % прадпрымальніцкіх структур займаюцца аптовым і рознічным гандлем, а таксама рамонтам аўтамабіляў і матацыклаў, 12 % спецыялізуецца на транспартных паслугах, складаба́нні, паштовай і кур'ерскай дзейнасці. У прамысловасці занята 8 %, у навуковай і тэхнічнай дзейнасці — 7 %, столькі ж — у будаўніцтве...

Сёлета адной з пазачарговых сесій Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў народныя выбраннікі прагаласавалі за тое, каб за пяцігодку для падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу з бюджэту было вылучана каля 10,7 мільёна рублёў.

Паводле слоў старшыні камітэта эканомікі аблвыканкама Веранікі Забалуевай, больш за 85 % з гэтай сумы накіроўць на падтрымку структур, якія спрыяюць распачынанню і развіццю бізнесу. Сярод іх — «Віцебскі абласны цэнтр маркетынгу», «Аршанскі рэгіянальны цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва і нерухомасці», полацкі «Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва» і гэтак далей. Падтрымліваецца і дзейнасць інкубатараў, якія дапамагаюць тым, хто хоча праявіць дзелавую ініцыятыву.

Закон «Аб прадпрымальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь» быў прыняты трыццаць гадоў таму, у маі. На поўначы краіны ў гонар гэтага юбілею правялі розныя мерапрыемствы.

У прыватнасці, у абласным цэнтры арганізавалі акцыю з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, бізнес-саюзаў і камерцыйных арганізацый — займаліся азеляненнем тэрыторыі прадпрыемства, дзе будуць вырабляць унікальныя ветэрынарныя прэпараты. Безумоўна, серыя «Зялёная лінія» — альтэрнатыва антыбіётыкам» ад ТАА «Белкаралін» стане вельмі запатрабаванай, бо пакупнікі ў ліку іншага змогуць займацца «чыстай» жывёлагадоўляй. Удзел чалавека ў вытворчым працэсе звядуць да мінімуму, і па сутнасці, у будучыні менавіта такія прадпрыемствы стануць звычайнымі. Завод будзе функцыянаваць на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск». Прадпрыемства мае статус рэзідэнта Парка высокіх тэхналогій. Прадукцыя, якая ўжо вырабляецца, каля сямнаццаці гадоў паспяхова рэалізоўваецца ў Беларусі, Расіі, Казахстане...



Адной з іншых новых вытворчасцяў на тэрыторыі СЭЗ «Віцебск» стане выраб запалкавай саломкі і пачкаў. У якасці прыярытэтных рынкаў збыту разглядаюцца Індыя, Афрыка, Паўднёвая Амерыка. Дарэчы, цікава, што ініцыятару гэтага праекта належыць кампанія SOCALCO SARL (Конга), якая ўваходзіць у групу кампаній DEWJI International і з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам запалак на афрыканскім кантыненце.

У Падзвінні прадпрымальніцкія структуры, калі працягваць размову пра вытворчасць, вырабляюць, бадай, усё: ад шкарпэтак да сельскагаспадарчых агрэгатаў.

Вельмі багаты выбар і паслуг, у тым ліку нават касмічных. Віцебская кампанія «Рэсурскантроль» прапаноўвае GPS-маніторынг транспарту. Спадарожнікавае назіранне дазваляе павысіць эфектыўнасць выкарыстання аўтапарка, фіксаваць фактычныя выдаткі, кіраваць імі на аснове атрыманых аналітычных даных, скарачаць выдаткі на ўтрыманне аўто... А яшчэ магчыма аптымізаваць лагістыку, як і аператыўна атрымліваць неабходную інфармацыю для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў. З зорнай вышыні прасачыць, каб не злівалі паліва, каб вадзіцелі не эксплуатавалі чужую тэхніку для сваіх мэт... Спрабаваць жа неяк падмануць «зорнае вока» — толькі дарма час траціць...

Менавіта павелічэнне колькасці навукаёмістых вытворчасцяў і паслуг — прыярытэтныя вектары развіцця прадпрымальніцтва. Адпаведна, тыя, хто застанецца ў гэтай нішы бізнесу, атрымаюць ад улады асаблівую падтрымку.

У Віцебску працягваецца рэалізацыя праграмы па стварэнні «сіліконавай даліны». З бюджэту ў праект інвеставалі каля 4 мільёнаў рублёў. У гэтым парку інфармацыйных і інавацыйных тэхналогій ужо бягучым летам чакаюць рэзідэнтаў, якіх не толькі пракансультуюць, але і акажуць усебаковую дапамогу. У прыватнасці, для аптымізацыі дзейнасці дадуць ільготы па выплаце падаткаў і розныя іншыя прэферэнцыі. А калі пойдзе размова пра навукаёмістую, інавацыйную дзейнасць, тады, можна сказаць, рэзідэнтаў чакае «падатковы» рай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Фільм з міжнародным прызнаннем

**Дакументальная стужка «Санеты памяці. Кінааператар Таццяна Логінава» ад рэжысёра і прадзюсара Сяргея Кацьера ўзнагароджана спецыяльным дыпломам журы XXX МКФ «Залаты Віцязь»**

**Тэлепрэм'ера фільма «Санеты памяці» адбылася ў снежні мінулага года і была прымеркавана да Дня беларускага кіно. Сваю новую дакументальна-біяграфічную работу Сяргей Кацьер прысвяціў Таццяне Логінавай — адной з самых знакамітых жанчын-кінааператараў гульнявога кіно на постсавецкай прасторы, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі СССР, з-пад майстэрскай рукі якой выйшлі адметныя ваенныя, гістарычныя і меладраматычныя стужкі, у тым ліку экранізацыі класікаў айчыннай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава і Івана Шамякіна — «Знак бяды», «Чорны замак Альшанскі», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Глыбокая плынь» і іншыя.**



У маі стужка «Санеты памяці» брала ўдзел у асноўнай конкурснай праграме дакументальнага поўнага метра міжнароднага кінафоруму «Залаты Віцязь» — найбуйнейшага і найстарэйшага расійскага фестывалю духоўна-асветніцкага кіно, дзе была ўдастоена спецыяльнага дыплома журы «За нетрывіяльнае рэжысёрскае рашэнне ў жанры творчага партрэта». Фільм прадстаўляла ў Севастопалі творчая група тэлеканала «Беларусь 3» — аўтар і рэжысёр Сяргей Кацьер, які, дарэчы, таксама ўваходзіў у склад журы ад нашай краіны ў секцыі кароткага дакументальнага метра, і аператар стужкі Дзяніс Бутылін.

Варта адзначыць, што па выніках юбілейнага «Залатога Віцязя» сацыякультурны тэлеканал рыхтуе шэраг тэматычных выпускаў уласных праектаў. Так, у хуткім часе гледачоў чакаюць серыі праграмы «Камертон» з удзелам рэжысёраў Мікалая Бурляева, Сяргея Зайцава, Валерыя Цімошчанкі і Горана Паскалевіча, а таксама спецвыпускі праекта «Культурны рэпартаж», прысвечаныя юбілею кінафоруму і знакамітым айчынным майстрам кіно, анімацыі і музыкі, якія не раз станавіліся лаўрэатамі, пачэснымі гасцямі і сябрамі «Залатога Віцязя» на працягу ўсёй яго трыццацігадовай гісторыі.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.**

## ШАШКІ
**(«Звязда»)**

**Выпуск № 141**

16 мая на платформе «ПлейОк» адбыўся ІІ Міжнародны анлайн-турнір па шашках-64 памяці выдатнага кіеўскага трэнера В. Д. Вайсера.

У турніры прыняло ўдзел 289 шашыстаў з 30 краін свету. Перамог украінскі гросмайстар Ю. Анікееў. Найлепшым сярод беларускіх удзельнікаў стаў Андрэй Валюк: у яго 5-е месца.

Сёння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№ 63**



**№ 63**

**Белыя простыя шашкі:** a1, e3, d4, f4, e5, f6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, c3, b4, b6, b8, h8 (6).

**№ 64**

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, g3, g5, b6, a7 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b4, d4, a5, c5, e5, d6, c7, d8 (8).

**№ 65**

**Белыя простыя шашкі:** e1, g3, d4, h4, e5, d6, h6 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, f2, c3, b4, b6, f8 (7).

**№ 66**

**Белыя простыя шашкі:** 47, 42, 37, 32, 27, 29 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 36, 22, 18, 14, 7, 8 (7).

**№ 67**

**Белыя простыя шашкі:** 49, 37, 38, 31, 32, 35, 27 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 17, 18, 20, 15, 7 (6).

**№ 68**

**Белыя простыя шашкі:** 37, 40, 32, 34, 27, 30, 20 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 45, 38, 22, 18, 7, 8 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Праверце свае рашэнні

**Выпуск № 140 ад 21.05.21.**

№ 57 f6.f8.c7.b4.g3.e3.c3+.

№ 58 hg5.a7.e7.c7.h6.g1+.

№ 59 12,3(39)18,49+.

№ 60 41,19(27)8,2,2:35:7,1(40)45+.

№ 61 1.h2-g3 1.40/19 — 7.46 e5:e1 2.g3:g7 f8:h6 3.h4:d8 e1-b4.

[ 3...e1-h4 4.d8-f6 (4. g1-f2 h4:e1 5. a3-b4 e1:a5 6. c5-b6 a5:c7 7. d8:b6 h6-g5 8. b6-e3 g5-h4 9. e3-f4 b8-a7 10. f4-c7 h4-g3)

4. d8-b6 b4:e7 5. b6-c5 e7:b4 6. a3:c5 h6-g5 7. g1-f2 b8-c7 8. f2-e3 +.

№ 62 1. c1-d2 x7/51 — 0.02 c3:g3 2.a1:c3 x6/51 — 0.01 f4:b4 3.h2:f8 h6:f4 4.f8:c7 d8:b6 5.a3-b4+.

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

Пішыце па адрасе: 220013, г . Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда», e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Песні, якія не забываюцца

Дакументальны фільм пра Уладзіміра Мулявіна, 80-годдзе якога адзначаецца сёлета, і яго знакаміты калектыў пакажуць на тэлеканале АНТ 19 чэрвеня

**У Савецкім Саюзе ў 1970-я гады слава ансамбля і яго кіраўніка была проста фенаменальная. Іх «Рушнікі», «Каляду», «Волагду», «За паўгадзіны да вясны», «Белавежскую пушчу», «Бярозавы сок» і іншыя кампазіцыі спявала і слухала ўся краіна. Працуючы ў Беларусі, «Песняры» пазбягалі пільнай увагі цэнзараў і не ўдзельнічалі ў кланавай барацьбе. Усё гэта дапамагло Уладзіміру Мулявіну стварыць унікальны ансамбль, у якім кожны выканаўца быў не толькі прафесіянал, але і мог прадэманстраваць сваю яркую асобу.**



«Залаты састаў» ансамбля выклікаў сапраўдны фурор у ЗША, і ў снежні 1976 года часопіс «Білборд» апублікаваў артыкул «Уварванне рускага рока ў заходні», а амерыканскі імпрэсарыя, які арганізаваў гастролі «Песнярам», прызнаўся, што змог зарабіць на гэтым мільён долараў. Амерыканскі музыкант Кірк Джэксан (ён таксама ўдзельнічаў у тых выступленнях) і да сённяшняга дня захоўвае дома аўтограф Мулявіна — тэкст і ноты адной з песень. Міжнароднае прызнанне да калектыву прыйшло ў Канах у 1975 годзе, калі на фестывалі «Мідэм» у пошуках новага музычнага матэрыялу сабраліся імпрэсарыя з усяго свету. Напярэдадні канцэрта музыкантаў папярэдзілі: маўляў, тут сабраліся найлепшыя прадстаўнікі прадзюсарскай супольнасці, фірмаў гуказапісу — таму авацый не чакайце. Але потым удзельнік «Песняроў» Леанід Барткевіч згадваў: «Праспявалі. У зале абсалютная цішыня. Тут мы зусім палі духам: усё, думаем, прыехалі... Не ведаю, колькі секундаў доўжылася тая цішыня, але нам здалося — вечнасць. Але тут адбыўся цуд — важная публіка, што зіхацела брыльянтамі, проста ўзарвалася апладысментамі». Там жа калектыў акампаніраваў Але Пугачовай, пасля чаго паміж спявачкай і Мулявіным узнікла сяброўства.

Аўтарытэт Уладзіміра Мулявіна ў прафесійным асяродку быў таксама бясспрэчны. Калі Уладзімір Высоцкі задумаў запісаць пласцінку, то звярнуўся менавіта да яго. Дамовіліся пра сустрэчу перад спектаклем, але туды прыйшоў не Мулявін, а яго музыканты. Так разам выдатныя артысты і не паправацалі.

Са многімі дэталямі біяграфіі артыста шырокая публіка яшчэ не знаёмая. Здымачная група разам з яго пляменніцай пабывала ў знакавых для Уладзіміра Мулявіна мясцінах у Екацярынбургу. Там, напрыклад, у Доме культуры «Уралмаш» дагэтуль іграе на кларнэце Аляксандр Завадскі — музыкант першай групы, якую Уладзімір Мулявін сабраў з тымі, хто любіў джаз... Пра ўсё тое, што засталося пасля яго і што адбывалася ў жыцці знакамітага калектыву, у фільме раскажуць яго дзеці, калегі і іншыя музыканты.

**Алена ДРАПКО.**


## «Звязда» — руплівым гаспадарам»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 13 ліпеня 2021 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 16 ліпеня 2021 года будуць разыграны 7 набораў садовага інструменту Palisad 63020 і суперпрыз — бензакаса Spec-2501. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам» чытайце ў нумары 101 газеты «Звязда» ад 1 чэрвеня.



**Тэлефон для даведак: (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2021 да 30.09.2021.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3996 ад 25.05.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2021 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

____________ **на III квартал або II паўгоддзе 2021 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «За крок ад раю». Закл. серыі (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Уцякачка-2» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 1.05** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.45** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.30** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**9.40, 20.35** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.15** Камень, нажніцы, папера (16+).
**10.45** «На тыдзень» (16+).
**11.30** «Да пабачэння» (16+).
**12.20 Вестэрн «Адзінокі рэйнджар» (12+).**
**14.50** Анімацыя для ўсёй сям'і «Рапунцэль: заблытаная гісторыя» (12+).
**16.25** «Каралі палат». Скетчкам (16+).
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Арол і рэшка-3» (16+).
**18.35** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**19.30** Тэлебарометр.
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.20** Хачу ў тэлевізар!
**23.25 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Балабешкі.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.05** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**9.40 «Прыгоды Бураціна». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**12.20** «Беларуская кухня». Мяса ў цесце.
**12.50** «Наперад у мінулае».
**Летась на смеццевым палігоне сталіцы было захавана 578,8 тысячы тон камунальных адходаў. На прадпрыемствах «Экарэз» і «Спецкамунаўтатранс» адсартавана больш як 3,5 тысячы тон паперы і кардону, звыш 4 тысяч тон шкла, больш за 3,1 тысячы тон палімераў і каля 350 тон зношаных шын. Практычна ва ўсіх сталічных дварах устаноўлены еўракантэйнеры для збору другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), а дэпазітна-закладную сістэму па здачы ў тараматы алюмініевых бляшанак, ПЭТ-бутэлек і шклянак плануецца ўкараніць у 2021—2022 гг. Пра сістэму раздзельнага збору смецця і камунальных адходаў расказала Настасся ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду і рабоце з насельніцтвам Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі.**

### Сметніцы — у кожны двор

Летась у красавіку рашэннем Мінгарвыканкама была зацверджана схема абарачэння з камунальнымі адходамі ў сталіцы, згодна з якой у сектары індывідуальнай забудовы прадугледжаны толькі кантэйнерны спосаб збору і вывазу смецця. Жыхарам для гэтага выдалі па два 120-літровыя кантэйнеры: для цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) і другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) — шкла, паперы і пластыку. Усяго мінчане атрымалі 28 657 такіх кантэйнераў. З іх 12 987 — сметніцы для ДМР, якімі забяспечана 92 % падвор'яў. Кантэйнеры для ЦКА маюць абсалютна ўсе гаспадары прыватных сядзіб.

— Сёлета плануецца на 100 % забяспечыць усіх і кантэйнерамі для другасных рэсурсаў. Першачэргова маюць намер перадаць жыхарам 914 кантэйнераў: 482 — для збору ДМР і 432 — для ЦКА — там, дзе адной такой сметніцы недастаткова, — падкрэсліла Настасся Вараб'ёва.

Дзякуючы гэтаму ў Мінску значна падрос працэнт выкарыстання другасных рэсурсаў: ад 25,7 % у 2019-м да 27 % — летась, а сёлета плануюць дарасці да 30 %.

У законе аб абарачэнні з адходамі ўказана, што фізічныя асобы абавязаны забяспечыць збор адходаў і іх раздзяленне па відах, калі абслуговая арганізацыя стварыла для гэтага ўмовы. А сёння яны ёсць і ў сектары індывідуальнай забудовы, і ў шматкватэрным фондзе. У апошнім устаноўлена 8480 кантэйнераў для збору ДМР, прычым асобна для шкла, паперы і пластыку. Аднак актуальнай застаецца праблема безадказнага стаўлення да гэтага патрабавання, заўважыла спецыяліст:

— Усе адходы з кантэйнераў для збору ДМР вывозяцца спачатку на лініі сарціроўкі, дзе з іх вымаецца другасная сыравіна для перапрацоўкі. Аднак у такім смецці часта сустракаецца, і даволі шмат, цвёрдых камунальных адходаў, якія не падлягаюць перапрацоўцы.



### І кансервацыя смеццеправодаў

У сталічных дварах летась зрабілі 389 модульных канструкцый для збору адходаў. Гэта закрытая з чатырох бакоў металапрофілем пляцоўка з агароджай. Модуляў існуе некалькі відаў: для раздзельнага збору адходаў з трыма кантэйнерамі для шкла, паперы і пластыку, для буйнагабарытнага смецця, тры віды модуляў для ЦКА. Сёлета ўстаноўку модульных канструкцый плануюць працягваць.

Як і кансервацыю смеццеправодаў: у Мінску застаецца яшчэ 7795. Каб законсерваваць іх, патрэбна згода большай часткі жыхароў і ўласнікаў кватэр у доме. За першы квартал сёлета ўжо законсервавана 67 ствалоў смеццепровадаў. Для жыхароў, якія пагадзіліся пазбавіцца ад смеццеправодаў і побач з дамамі якіх няма кантэйнерных пляцовак для смецця, модульныя канструкцыі ўсталююць у першую чаргу.

— Бывае, што ў двары немагчыма абсталяваць кантэйнерную пляцоўку. Тады практыкуецца стварэнне смеццепрыёмных камер, на якіх за кошт жыхароў ладзяць кодавы замок або робяць у смеццевай камеры дзверцы, якія дазваляюць выкінуць камунальнае смецце ў кантэйнер, што знаходзіцца ў камеры, — удакладніла Настасся Вараб'ёва.

Задача па мінімізацыі выкарыстання пластыкавай тары і замене яе папяровай ці кардоннай у краіне ўжо пакрысе рэалізоўваецца, падкрэсліла яна. У многіх кафэ хуткага харчавання і на запраўках выкарыстоўваецца кардонны посуд замест пластыкавага, у буйных крамах у продажы ёсць пакеты для пакупак з тканіны.

**Ірына СІДАРОК.**

А У НАС У ДВАРЫ

# КАЛІ Ў СУСЕДА РУКІ ЗАЛАТЫЯ

## Дамавы камітэт у горадзе Высокае ўзнік дзякуючы ініцыятыве адной сям'і

**У доме 102 па вуліцы Савецкай налічваецца 24 кватэры. Гэты трохпавярховы будынак у Высокім узвялі сорак гадоў таму. Жывуць у ім зараз у асноўным людзі пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту. З усіх жыльцоў — толькі дзве маладыя сям'і. Але дом у мікрараёне, які называюць Сельгастэхніка, выгадна вылучаецца на фоне астатніх. А ўсё таму, што некалі тут паявіўся ініцыятыўны і працавіты сусед Вадзім Курбанаў.**



Яго жонка Сняжана Курбанава расказвае, што пасля вяселля пераехала да мужа ў звычайны дом з чатырма пад'ездамі. У двары насупраць нічога не было, толькі дрэвы раслі. Стымулам для паляпшэння навакольнай тэрыторыі стала нараджэнне ў маладой сям'і дачушкі Насці. Зараз ёй, дарэчы, 12 гадоў. А тады Вадзім зрабіў першыя арэлі. Цяпер на іх з задавальненнем гушкаюцца дзеці нават з суседніх двароў.

Далей — болей. З часам паявіліся разнастайныя арэлі і гушкалкі з улікам узросту дзяцей. Пабудавалі таксама простыя прылады для заняткаў спортам, якія аказаліся запатрабаванымі. Сталі больш праводзіць часу ў двары, захацелася палепшыць тэрыторыю вакол пад'ездаў. У Вадзіма паступова з'явіліся памочнікі і аднадумцы, якія таксама выходзілі і дапамагалі. З часам у добрую справу ўцягнулі ўсіх суседзяў.

— Мы пачалі рэгулярна выходзіць на суботнікі, прыбіралі, садзілі кветкі, — расказвае Сняжана. — Калі заўважалі, як навокал станавілася прыгожа, з'яўлялася жаданне працягваць далей. Потым сталі збіраць грошы, куплядь фарбу, насенне кветак, саджанцы дрэў. Уздоўж двара пасадзілі туі. Добраўпарадкаванне набывала новыя формы.

Паводле яе слоў, у доме, дзе большасць пенсіянераў, для некаторых складана бывае выдзеліць пэўную суму з уласнага бюджэту на агульную справу. Таму людзі даюць колькі хто можа, астатняя ўсё разумеюць. «Галоўнае, што мы ў сваім доме жывём дружна», — заўважае жанчына.

Ну а дамавы камітэт арганізацыйна афармілі ў 2018 годзе, калі гарадская ўлада заўважыла іх ініцыятыву, сумесную работу і падтрымала. Вядома, старшынёй камітэта аднадушна абралі Вадзіма Курбанава. Пасля афармлення дакументаў дамавы камітэт стаў удзельнічаць у розных конкурсах і гарадскіх мерапрыемствах. Летась, напрыклад, занялі прызавое месца на абласным конкурсе і атрымалі заслужаную прэмію. Грошы скарысталі на чарговы праект.

Ну і па-ранейшаму асноўную частку работы жыльцы дома па Савецкай робяць сваімі рукамі. Падгледзелі ідэю прыгожых лавак у гарадскім скверы. Прыкінулі, колькі гэта будзе каштаваць, калі заказаць вырабы, і рашылі зрабіць іх самі. Сусед Станіслаў Сілюк разам з бацькам, спецыялістам па зварцы, і Вадзімам зварылі металічную аснову, прыладзілі дошкі — атрымалася прыгожа. Ёсць тут і альтанка з драўлянымі лаўкамі ў двары насупраць, дзе можна пасядзець у цяньку, пакуль дзеці гуляюць, альбо пагаварыць з суседзямі, нават чаю папіць. Каля пад'ездаў устаноўлены дамкі-керамкі і цуд-млыны — малыя архітэктурныя формы, плён любімага хобі Вадзіма. А на чарзе — новыя задумкі і праекты.

**Старшыня Высокаўскага гарадскога Савета Аляксандр РАГАЛЬЧУК:**

— Дамавы камітэт па Савецкай, 102 з'яўляецца прыкладам таго, як самакіраванне нараджаецца з ініцыятывы і работы актыўных, нераўнадушных людзей, развіваецца і становіцца своеасаблівым рухавіком прагрэсу, хай сабе і на такім невялікім узроўні. Але ў выніку паляпшаюцца знешні выгляд тэрыторыі, якасць жыцця людзей, іх настрой.

Зараз у нас у горадзе створаны яшчэ тры дамавыя камітэты, але ім трэба набірацца вопыту, расці ў арганізацыйным плане і вучыцца ў суседзяў з вуліцы Савецкай!

Маладая мама Кацярына, якая гуляла з дзецьмі, сказала, што яны прыходзяць сюды з суседняй вуліцы, бо дзеці просяцца на арэлі. Карыстаючыся прысутнасцю кіраўніка гарадской улады, гараджанка папрасіла паставіць і дзіцячую горку. Аляксандр Сяргеевіч сказаў, што сёлета гэта цалкам рэальна, бо гарвыканкам бачыць стараннасць, арганізаванасць людзей і ва ўсім іх падтрымлівае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

# Крадуць... лес

**Апошнім часам адзначаецца рост попыту на піламатэрыялы, вырас і іх кошт. Гэтым карыстаюцца асобныя нядобрасумленныя грамадзяне. Спецыялісты інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету толькі ў маі зафіксавалі сем фактаў парушэнняў правілаў перавозкі драўніны ў Брэсцкай вобласці.**

— Негатыўная статыстыка працягваецца і ў чэрвені, — гаворыць **намеснік начальніка абласной інспекцыі Сяргей МЫЧКО.** — Напрыклад, 3 чэрвеня быў устаноўлены факт крадзяжу 14 кубаметраў дзелавой драўніны коштам 1918 рублёў з часовага склада ў лясным фондзе Бронна-Горскага лясніцтва ў Бярозаўскім раёне.

У ходзе правядзення неадкладных мерапрыемстваў устаноўлены прадпрымальнік, які здзейсніў крадзеж. Драўніна канфіскаваная, праводзіцца праверка. А прадпрымальніку давядзецца адказваць па законе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2021 года.

# Горад, дзе ўсім будзе цікава

## «Вытокі» любові да сваёй гісторыі пачынаюцца ў Кобрыне

**Гэтым летам культурна-спартыўны фестываль «Вытокі» аб'ядноўвае ўсю краіну. Свята ўжо прайшло ў Лідзе і Оршы. Эстафету з 10 да 12 чэрвеня прыме Кобрын. Гэтаму гораду ёсць што паказаць гасцям. Што менавіта — высвятляла карэспандэнт «Звязды».**

Аляксандр Чырун, навуковы супрацоўнік Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя Суворава, раіць пачаць знаёмства з горадам менавіта з музея. «Пабываць у Кобрыне і не пабываць у музеях — зусім нельга. У нас дзве найцікавейшыя экспазіцыі. Адна — «Сем стагоддзяў Кобрына», прысвечаная ваеннай гісторыі горада са старажытных часоў і да канца XX ст. А другая экспазіцыя — дом-музей А. В. Суворава, дзе прадстаўлены рэчы XVIII ст.», — расказвае супрацоўнік музея. У музеі можна ўбачыць экспанаты, якіх няма больш нідзе


Помнік князю Уладзіміру Васількавічу і князёўне Вользе Раманаўне ў Кобрыне.

ў Беларусі, у тым ліку старажытная зброя і асабістыя рэчы расійскіх імператараў. Большасць рарытэтаў аказалася ў Кобрыне дзякуючы першаму дырэктару музея Аляксею Міхайлавічу Мартынаву, які мае доступ да фондаў Эрмітажа.

## ПА СУВОРАЎСКІХ СЛЯДАХ

Імя Аляксандра Васільевіча Суворава, бадай, — ці не галоўная прынада для турыстаў. У 1795 годзе за разгром паўстання Тадэвуша Касцюшкі і іншыя заслугі імператрыца Кацярына II падарыла фельдмаршалу маёнтак «Кобрынскі Ключ». Першы раз ў Кобрыне Суворва прабыў паўтара месяца. Другі раз палкаводзец прыехаў у беларускі гарадок пасля вяртання з італьянска-швейцарскага паходу 1800 года ва ўзросце 69 гадоў, ужо глыбока хворым. Жыў ён у звычайным шляхецкім доме за межамі горада (цяпер тут гарадскі парк імя Суворава). Папулярны сёння сярод турыстаў і гараджан парк заснаваны яшчэ ў другой палове XVIII стагоддзя, старыя ліпы памятаюць самога Суворава і іншых знакамітых дзеячаў, якія наведвалі Кобрын. 12 чэрвеня ў гісторыю парку ўвойдзе і фестываль «Вытокі», дзе адбудзецца кульмінацыя свята — спартыўны квэст. Але вернемся да Суворава.

Як адзначае Аляксандр Чырун, для развіцця горада Сувораў нічога не паспеў зрабіць. Першы раз не хапіла часу, другі — здароўя. Аднак кабрынчане яго не забылі. Вялікі палкаводзец часта наведваў Петрапаўлаўскую царкву, спяваў там у хоры, на клірасе, званіў у званы. У народзе царкву прозвалі суворaўскай. Тады храм стаяў на месцы сённяшняга сквера Марозава. Але казаць у мінулым часе пра яго не варта, храм перанеслі ў іншае месца. «Калі ў 1900 годзе адзначалі 100-годдзе з дня смерці Аляксандра Суворава, было вырашана на месцы старой царквы пабудаваць новую, якую хацелі назваць Петрапаўлаўскай-Суворaўскай. Са старога храма ўсё вынеслі, знялі ўбранства, паставілі яго на бярвёны і... пакацілі па горадзе на новае месца. Усталявалі храм на старых могілках, дзе ён стаіць і па сённяшні дзень», — расказвае Аляксандр Чырун.

## ПАМЯЦЬ У БРОНЗЕ

Прагульваючыся па пешаходнай вуліцы Суворава, варта звярнуць увагу на помнік княжацкай пары Уладзіміра Васількавіча і Вольгі Раманаўны. З імёнамі гэтых уладзіміра-валынскіх князёў Кобрын упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1287 годам. Князь Уладзімір Васількавіч завяшчае горад сваёй жонцы Вользе Раманаўне. «У гэтым дакуменце Кобрын ужо называецца горадам, гэта буйное паселішча на той момант. Безумоўна, ён старэйшы, але звестак аб гэтым у нас няма. Таму мы адштурхоўваемся ад 1287 года. Дарэчы, часта і журналісты, і аўтары кніг памыляюцца, пішуць, што князі — заснавальнікі Кобрына. Гэта не так, заснавальнікі невядомыя», — расказвае Аляксандр Чырун.

Сам помнік з'явіўся ў Кобрыне напярэдадні рэспубліканскага свята «Дажынкі» 2009 года. Аўтар помніка, скульптар Аляксандр


Парк імя А. В. Суворава.

Лышчык падарыў гораду яшчэ дзве скульптуры — боцмана на набярэжнай і кампазіцыю «Купалле» ў цэнтры фантана ў парку. У Кобрыне ўвогуле вельмі ўважліва ставяцца да скульптуры. Адны з самых вядомых славутасцяў горада — менавіта помнікі. Польскія турысты вельмі цікавяцца надмагільным помнікам Аляксандра Міцкевіча, роднага брата вядомага пісьменніка Адама Міцкевіча. У сярэдзіне XIX стагоддзя ён купіў маёнтак Губернія ў Кобрыне, які


Надмагілле Міцкевічаў.

раней належаў Сувораву. Сёння на гарадскіх могілках побач з Петрапаўлаўскай царквой вылучаецца помнік канца XIX стагоддзя ў выглядзе анёла ў жальбе. Гэты анёл аплаквае жонку і сына Аляксандра Міцкевіча, якія таксама тут пахаваны. На жаль, інфармацыі, ці бываў у Кобрыне Адам Міцкевіч, гісторыкі не маюць.

Візіткай Кобрына Аляксандр Чырун называе помнік рускім воінам. «15 ліпеня 1812 года ў Кобрыне была здабыта першая вялікая перамога над арміяй Напалеона ў межах Расійскай імперыі. Рускімі салдатамі былі разбіты саксонцы генерала Кленгеля. У гонар 100-гадовага юбілею гэтай перамогі і быў усталяваны помнік. Спачатку на пастаменце быў двухгаловы арол, як на гербе Расійскай імперыі. У дзюбе ён трымаў вянок з манаграмай імператара Напалеона Банапарта. Падчас Першай сусветнай вайны немцы знялі арла і што з ім зрабілі — невядома», — расказвае Аляксандр Чырун. З 1921 да 1939 года Кобрын знаходзіўся ў складзе Польшчы. Замест арла гарадскія ўлады ўсталявалі на пастаменце помніка бюст Тадэвуша Касцюшкі. У 1951 годзе ўжо аднагаловы арол з вянком у дзюбе і лапах заняў сваё места на пастаменце.

## ПАД БОЖАЙ АХОВАЙ

Аматарам рэлігійных славутасцяў варта наведаць Першамайскую вуліцу Кобрына. Тут размешчаны касцёл, сінагога і згаданая вышэй Петрапаўлаўская царква. Каменны касцёл Успення Прасвятой Дзевы Марыі быў пабудаваны ў 1843 годзе. У XIX стагоддзі кобрынскі касцёл увекавечыў у сваіх малюнках мастак Напалеон Орда.

Кобрынская сінагога — адна з самых вялікіх у Беларусі. «У нашым горадзе праходзіла мяжа яўрэйскай аседласці. Калі ўзяць насельніцтва Кобрына 1941 года — каля 70 % яўрэі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны амаль усе яўрэі, на жаль, былі знішчаны фашыстамі. А сінагога другой паловы XIX стагоддзя засталася, цяпер яна не дзейнічае, але цікавіць турыстаў як гістарычны помнік», — расказвае Аляксандр Чырун. На памяць ад яўрэйскага насельніцтва Кобрыну засталася гарадская забудова — двухпавярховыя дамы, якія сёння ўваходзяць у гістарычны цэнтр горада.

Абавязковы для наведвання Спаскі праваслаўны манастыр, самая старая пабудова Кобрына. Упершыню ён згадваецца ў 1465 годзе. Як расказаў Аляксандр Чырун, ёсць звесткі, што асновай манастыра была драўляная царква Святога Спаса. Яна ўпершыню згадваецца ў XIII стагоддзі падчас праўлення ўладзіміра-валынскіх князёў Уладзіміра і Вольгі. Таму фактычна манастыр, які спачатку


Свята-Петрапаўлаўская царква.

быў мужчынскім, бярэ свой пачатак з XIII стагоддзя. Пасля Берасцейскай уніі 1596 года манастыр перайшоў да ўніятаў. У першай палове XIX стагоддзя тут адкрылі духоўнае вучылішча, якое пасля адмены ўніі ў 1839 годзе вярнулі праваслаўнай царкве. У 1872 годзе вучылішча пераехала ў Жыровічы і паклала пачатак Жыровіцкай семінарыі. Падчас знаходжання Кобрына ў складзе Польшчы тут быў павятовы суд, у часы савецкай Беларусі — раённае аддзяленне міліцыі. І толькі ў 2010 годзе пабудовы XIX стагоддзя вярнуліся да праваслаўнай царквы.

## ТУРЫЗМ І МАТЭМАТЫКА

Гісторыя Кобрына — гэта гісторыя войнаў, паўстанняў, якія выпалі на лёс Беларусі. Амаль усе вызначальныя падзеі закранулі і Кобрын. Але на прывабнасць горада гэта не паўплывала. Для таго, каб гасцям было зручна знаёміцца з горадам, існуе праект «Пазнай Кобрын» — сайт, дзе сабраны ўсе славутасці горада. З яго дапамогай можна здзяйсняць рэальныя і віртуальныя прагулкі па Кобрыне. Лепей, канешне, рэальныя з дапамогай анлайн-гідаў, прадстаўленых на сайце праекта.

Унікальны праект ствараецца на чыстым энтузіязме настаўніка сярэдняй школы № 6 Віктара Лагвіновіча, яго бацькі і вучня. «Я па сваіх вучнях бачу, што яны не ведаюць і не цікавяцца гісторыяй горада. Таму асноўная мэта нашага праекта — зацікавіць моладзь гісторыяй. Я ведаю, што госці горада ўжо карыстаюцца нашым сайтам, бо гэта адзіная пляцоўка, дзе сабраны ўсе славутасці Кобрына і Кобрынскага раёна», — расказвае Віктар Лагвіновіч. Цікава, што пачаўся праект з матэматыкі — менавіта гэты прадмет Віктар выкладае ў школе. «Мы даведаліся, што сусветна вядомы матэматык Аскар Зарыскі нарадзіўся ў Кобрыне, адкрылі яго біяграфію, знайшлі мноства цікавых фактаў. Потым мы пачалі даведвацца пра сувязь іншых выдатных асоб з Кобрынам (яны ўсе прадстаўлены на сайце праекта), і закруцілася», — адзначае Віктар Лагвіновіч.

Карыстацца сайтам «Пазнай Кобрын» вельмі проста. Дастаткова вызначыць на карце сваё месцазнаходжанне, і алгарытмы пракладуць маршрут да найбольш цікавых мясцін, апісанне якіх прадстаўлена ў тэкставым і аўдыяфармаце. А непасрэдна на самых славутасцях ёсць QR-коды, сканіраванне якіх прывядзе на старонку аб'екта з поўнай інфармацыяй аб ім. Інтэрактыўны гід не забудзе нічога і ўсё пакажа.

На сайце прадстаўлены старыя фотаздымкі горада, якім нейронныя сеткі вярнулі арыгінальныя колеры. А віртуальны тур па Кобрыне 1980-х адправіць наведвальнікаў сайта на 40 гадоў таму. Спалучэнне мінулага на экране тэлефона і сучаснага, убачанага ўжывую, пакажа поўную карціну Кобрына. «Каб стварыць поўнае ўражанне аб горадзе, і патрэбны такія праекты. Нас чакае яшчэ шмат працы, але мы маем мэту зрабіць усё дастойна і прывабна для людзей», — разважае Віктар Лагвіновіч, які нават платформу для сайта зрабіў сам. Дарэчы, праект «Пазнай Кобрын» стаў прызёрам трэцяй ступені міжнароднай прэміі «ТІБО-2021» у намінацыі «Адукацыя і навука». Гэта ўжо трэцяя падобная ўзнагарода для праекта. Але найлепшая ўзнагарода, канешне, — наведванне сайта і выкарыстанне яго падчас экскурсій па Кобрыне. Тым больш што дзякуючы 3D-турам зрабіць гэта можна, нават не прыязджаючы ў Кобрын. Аднак усё ж такі лепей прыехаць.

У свае часы Кобрын наведвалі такія вядомыя асобы, як Аляксандр Грыбаедаў, Пётр Баграціён, Рамуальд Траўгут, Павел Шпілеўскі, Канстанцін Паўстоўскі, Аляксандр Твардоўскі і іншыя. Можа, прыйшоў час унесці ў гэты спіс і сваё імя?..

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота праекта «Пазнай Кобрын».**
*г. Кобрын.*

# ПЕРШАЕ ПРЫВІТАННЕ ЛЕТА

## Клубніцы і чарэшня — шукаем, дзе танней

**Сезон клубніц і чарэшні пачаўся! Калі вы хочаце падтрымаць імунітэт, пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў або проста назапасіць вітамінаў — пара на рынак. Дарэчы, дыетолагі сцвярджаюць, што ягады лепшыя за садавіну: яны не выклікаюць закісання ў страўніку і ўтрымліваюць антыаксіданты, якія дапамагаюць даўжэй заставацца маладымі.**

У дзяцінстве лета — гэта цэлае жыццё, а цяпер — усяго толькі тры зарплаты. Але такія-сякія прыкметы «летніх канікулаў» усё ж захаваліся і для дарослых. У горадзе лета пачынаецца з сезона клубніц, цана на якія за некалькі тыдняў змяняецца ад дарагой да больш-менш бюджэтнай. Потым надыходзіць сезон чарэшні. Сёлета, напэўна, з-за зацяжной халоднай вясны, абодва «ягадныя сезоны» супалі.




### КЛУБНІЦЫ

— Клубніцы беларускія, — кажа прадавец Святлана.

Яе кіёск з гароднінай-садавіной размешчаны ў адным са спальных раёнаў сталіцы. Брэсцкія клубніцы Святлана прадае па 10.90. Дорага, на рынку танней. Затое каля дома, нікуды не трэба ехаць. Клубніцы ў гэтым годзе сапраўды ўдалыя — салодкія, духмяныя.

— Для клубніц добра, што ў маі было нягорача і пры гэтым няшмат дажджоў, — тлумачыць Ірына. Яна гандлюе ягадамі на «Камароўцы». — Для клубніц такі май — тое, што трэба. Ягады паспелі выспець паступова, назапасіўшы дастатковую колькасць цукроў і вітамінаў. Вось калі б пры тым надвор'і, якое было ў канцы мая, зарадзілі дажджы, клубніцы маглі б пачаць гніць.

На адкрытых радах галоўнага сталічнага рынку цяпер клубнічны сезон. Як сцвярджаюць прадаўцы, у дзень з аднаго пункта сыходзіць кілаграмаў 50—60 гэтых ягад. Яшчэ нядаўна прадавалі клубніцы з Грэцыі, цяпер усе гэтыя ягады на адкрытым рынку — брэсцкія. Клубніцы — вельмі далікатныя ягады, везці іх да пункта продажу ў сезон імкнуцца на максімальна кароткія адлегласці. А пакупніку лепш прасіць фасаваць ягады ў скрыначкі, а не ў пакеты — так яны лепш захоўваюцца па дарозе дадому.

Клубніцы — любімыя ягады дыетолагаў, прафесіяналаў б'юці-сферы і кардыёлагаў. Калорый мала, а карысці — шмат. Напрыклад, даказана, што яны здольны забяспечыць прафілактыку анкалогіі страўніка-кішачнага тракту. А яшчэ рэгулярнае ўжыванне клубніц зніжае рызыку развіцця інфарктаў і інсультаў, паколькі ягады чысцяць арганізм ад халестэрыну.

— Таннець клубніцы будуць?

— Гэта залежыць ад цэн у фермераў, — тлумачыць Ірына. — Учора па 7,50 прадавалі, сёння — па 9. Там дажджы ў іх пайшлі. Калі будзе мала ягад, яны будуць даражэйшыя. Але таннейшых, чым на «Камароўцы», не знойдзеце, — запэўнівае суразмоўніца.

Расцэнкі такія: на латках па горадзе клубніцы — ад 10,90 да 10 рублёў, на адкрытым рынку — у залежнасці ад памеру ягад, іх стану, сорту і месца ў радах ад 9,50 да 7,50.

Купляючы клубніцы, найперш трэба глядзець не на ягады, а на латок, расказалі на рынку. Калі на сценках латка ёсць кавалачкі расціснутых ягад, клубніцы наўрад ці свежыя. Ну і, вядома, калі ёсць магчымасць, старанна агледзьце ягады, якія вам паклалі ў скрыначку або мяшок — нават адна «гнілушка» можа «заразіць» спорамі астатнія. Дома клубніцы варта адразу ж перабраць, выдаліць усё, што выклікае сумненні (іх трэба тут жа з'есці або выкарыстаць, напрыклад, у начынцы для пірагоў). Мыць клубніцы перад захоўваннем не варта — яны раскіснуць, а захоўваць можна ў халадзільніку дні тры. Для больш працяглага захоўвання ягады замарожваюць. Ну і закаткі ніхто не адмяняў.

### ЧАРЭШНЯ

А вось чарэшню ў Мінск вязуць здалёк. Яна даражэйшая за клубніцы — як, зрэшты, і ўсе папярэднія гады. Сёлета на латках па горадзе чарэшня пакуль што па 16, 15, 13 і 12 рублёў.

— Па 12 — гэта, напэўна, малдаўская, яе на «Камароўцы» пашукайце, — маркуе Святлана. — У мяне такой няма. У мяне чарэшня ўзбекская. Па 15-16 — адборная, суперсалодкая, а па 13 — з кіслінкай. А малдаўскую чарэшню я наогул не люблю. Яе трэба перабіраць — яна з «мясам» ідзе.

— У сэнсе — з «мясам»?

— З чарвячкамі.

— Дык кажуць, гэта азначае, што ягада экалагічна чыстая.

— Можа, і так, але я, напрыклад, грэбую такую экалагічна чыстую ягаду есці.

У чарэшні мала цукру і мала вугляводаў, затое — антыаксіданты, цэлы спектр вітамінаў (у прыватнасці, шмат вітаміну С), шмат жалеза і яшчэ яна пазбаўляе ад ацёкаў. Так што, калі фінансы дазваляюць, гэта аптымальныя ягады для правядзення разгрузачнага дня. Праўда, яны яшчэ і моцны алерген, так што малым дзецям іх можна есці толькі з года і не больш за дзве ягадкі на адзін прыём. Дарослым у дзень не варта есці больш за 200 грамаў, а ў разгрузачны — больш за паўкіло (у ідэале — 400 грамаў чарэшні на адзін такі дзень).

Малдаўскай чарэшні на «Камароўцы» мы не знайшлі. Дарэчы, акрамя Узбекістана і Малдовы, яшчэ яе вязуць да нас з Азербайджана, Сербіі, Іспаніі, Грэцыі, паўднёвых рэгіёнаў Расіі (Краснадарскі край, Растоўская вобласць), і нават з Паўднёвай Амерыкі. Сёлета на адкрытых камароўскіх гандлёвых радах уся чарэшня — іспанская і ўзбекская. Цэны «кусаюцца» і тут — 10,99, 9,99 за кілаграм, можна знайсці па 8,99, калі пашукаць. У канцы дня з дарагой чарэшні (якая па 11 рублёў) могуць скінуць капеек 70-80.

Сезон чарэшні звычайна пачынаецца на беларускіх рынках з пачаткам чэрвеня. Сёлета прадавалі ягады на «Камароўцы» ўжо ў пачатку сакавіка — праўда, па нерэальных цэнах: 220 рублёў за кілаграм чарэшні з Перу, 209 рублёў за кілаграм ягады з Чылі. Цэны тлумачылі цяжкасцямі транспарціроўкі. Тыя, хто паспрабаваў гэтую экстрэмальна дарагую чарэшню (купілі дзве ягадкі за 5 рублёў), пісалі ў сетцы: маўляў, чарэшня як чарэшня, проста буйная і мякаць больш шчыльная, чым звыклыя нам сарты. У маі чарэшня (ужо з нашага, паўночнага паўшар'я) каштавала 25-26 рублёў за кілаграм, і да чэрвеня «спусцілася» да вышэйназванага ўзроўню цэн.

Дарэчы, не ў сезон ягады купляць не варта: часам для яе захаванасці выкарыстоўваецца кансервант дыфеніл, які не карысны для здароўя ад слова «зусім». Каб праверыць, ці апрацавана чарэшня гэтым кансервантам, дастаткова заліць яе ў місцы гарачай вадой. Калі праз пяць хвілін на паверхні вады з'явіцца плёнка — ягада была апрацавана кансервантам. Каб пазбавіцца ад яго, можна замачыць ягады ў растворы соды на 10 хвілін (на 1 л вады — 1 ч. л. соды).

У свеце існуе каля 4 тысяч відаў і сартоў гэтых ягад. Ад сорту залежаць кіслінка або слодыч, колер, шчыльнасць ці вадзяністасць мякаці.




— Пакуль прадаюць раннія сарты чарэшні, яны не такія салодкія, — дзеліцца інфармацыяй прадавец Раміль. — Праз тыдзеньдва чарэшня будзе смачнейшая. Але наўрад ці моцна патаннее, я думаю.

Пакуль што ўся чарэшня на рынку — чырвоная. Жоўтая з'яўляецца пазней, таму што не надта добра пераносіць транспарціроўку, і яе імкнуцца везці бліжэй.

— Цёмная чарэшня заўсёды саладзейшая, а светлая больш карысная — у ёй больш вітаміну С, — распавядае прадавец Марына. — Часам пакупнікі думаюць, што цёмная чарэшня больш спелая, але афарбоўка ягад можа проста залежаць ад сорту. Мы звычайна прапануем пакупніку паспрабаваць ягадку.

— А як правільна выбіраць чарэшню?

— Трэба ў першую чаргу глядзець на «хвосцікі», — кажа суразмоўніца. — Яны павінны быць не сухія, зялёнага колеру. Карычневыя і сухія пладаножкі — значыць, ягада нясвежая. Пераспелыя ягады лёгка адвальваюцца ад «хвосцікаў». Яшчэ важна, каб костачка была невялікая. Калі яна занадта буйная, чарэшню здымалі няспелай і яна даспявала ў дарозе або на складзе. Тое ж самае, калі чарэшня аднаго сорту мае розную афарбоўку: ягадка святлейшая — ягадка цямнейшая. Дробныя дэфекты на ягадах — увагнутасці, драпіны — таксама паказчык дрэннай якасці чарэшні.

Дарэчы, на кожную партыю ягад у прадаўца павінны быць дакументы. У іх напісана, дзе сабраная чарэшня, калі яе збіралі, паказаны тэрмін прыдатнасці партыі.

Захоўваць чарэшню лепш за ўсё, замарозіўшы яе (костачкі перад замарозкай варта выдаліць). Лічыцца, што ў свежым выглядзе якасная чарэшня захоўваецца ў халадзільніку да 7-10 дзён. Калі хопіць сілы волі, можаце праверыць.

### І ІНШЫЯ ЛЕТНІЯ РАДАСЦІ

Абрыкос — не ягада, але абысці яго ўвагай нельга: абрыкосы — таксама першае прывітанне гэтага лета. Хоць сезон абрыкосаў надыдзе крыху пазней. Пакуль мінчанам прапануюцца ў асноўным турэцкія абрыкосы — буйныя, але цвердаватыя, ад 12 да 12,50 за кілаграм (у асноўным, у кіёсках па горадзе), і іспанскія, памерам меншыя, ад 11 да 13 рублёў за кілаграм (галоўным чынам, на рынках).

— Абрыкосы пакуль так сабе, — паведамляе прадавец Святлана. — Самыя смачныя — узбекскія, але яны будуць пазней. Яны не такія крупныя, як турэцкія, светленькія, невялікія, далікатна-жоўтага колеру.

Кошт залежыць ад якасці, знешняга выгляду і часу сутак. Перад закрыццём у будны дзень на «Камароўцы» атрымалася знайсці абрыкосы нават па 5,99. А яшчэ на рынках ужо актыўна гандлююць нектарынамі і персікамі новага ўраджаю (яны таксама іспанскія), па 7,50 за кілаграм. Так што лета нарэшце прыйшло.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

На слыху

## Дзеці крэйдай падрапалі аўто

**Увечары ў двары аднаго з дамоў па вуліцы Леніна ў Салігорску гуляла кампанія непаўналетніх. Яны забаўляліся маляваннем крэйдай на асфальце. У адзін з момантаў двое хлапчукоў, 9 і 10 гадоў, сталі наносіць надпісы на легкавыя аўтамабілі, размешчаныя на неахоўнай аўтастаянцы.**

Як паведамляе УУС Мінаблвыканкама, дзеці наносілі лініі і словы. Нявіннае свавольства павярнулася значнай матэрыяльнай шкодай — ад іх штукарстваў на лакафарбавым пакрыцці аўтамабіляў засталіся драпіны. Уладальнікі, выявіўшы пашкоджанні сваіх транспартных сродкаў, звярнуліся ў міліцыю.

Было ўстаноўлена, што непаўналетнія пашкодзілі лакафарбавае пакрыццё сямі аўтамабіляў. Пяць уладальнікаў транспартных сродкаў звярнуліся з заявамі. Двое па факце пашкоджання прэтэнзій да непаўналетніх і іх бацькоў не маюць.

«Пры правядзенні праверкі было ўстаноўлена, што арыенціровачна прычыненая падлеткамі шкода ацэньваецца на суму каля 1400 рублёў. Для кампетэнтнай ацэнкі мы звярталіся ў страхавую кампанію. Згодна з дзеючым заканадаўствам, шкоду, прычыненую дзецьмі, будуць абавязаны пакрыць іх законныя прадстаўнікі», паведамілі ў інспекцыі па справах непаўналетніх Салігорскага РАУС.

Па выніках праведзенай праверкі было прынята рашэнне аб адмове ў заводзенні крымінальнай справы за злоснае хуліганства — малалетнія на момант здзяйснення сваіх дзеянняў не дасягнулі ўзросту, з якога настае крымінальная адказнасць.

Аб прынятым рашэнні дадзена камісіі па справах непаўналетніх, інфармацыя таксама накіравана ва ўпраўленне па адукацыі Салігорскага райвыканкама для правядзення індывідуальнай прафілактычнай работы са згаданымі дзецьмі.

## Вясковец па частках раскраў... дом суседа

**Інцыдэнт адбыўся ў вёсцы Зорыцы Барысаўскага раёна, паведамляе УУС Мінаблвыканкама падрабязнасці гэтай гісторыі.**

Падазраванаму было вядома, што ранейшы гаспадар нерухомасці памёр, а вось пра тое, што з'явіўся новы ўласнік, мужчына, з яго слоў, не ведаў.

Як аказалася, домік у вёсцы некалькі гадоў таму набыў 31-гадовы мінчанін. Мужчына вельмі рэдка з'яўляўся на ўчастку, і менавіта з гэтай прычыны не адразу выявіў замах на сваю маёмасць.

Даведаўся пра здарэнне жыхар сталіцы пасля званка з сельсавета. У ходзе размовы ў яго ўдакладнілі, ці плануе ён нешта рабіць з участкам, паколькі, акрамя падмурка, на ім нічога няма. Ашаломлены гэтай навіной, мужчына неадкладна звярнуўся ў праваахоўныя органы.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Загараднага аддзела міліцыі Барысаўскага РУУС устанавілі, што да разборкі дома прылажыў руку 56-гадовы вясковец, які пражывае непадалёк. У перыяд з 2019 да 2021 года ён прабіраўся ў двор суседа і паступова разбіраў жытло.

Частку ўкрадзенага бярвення мужчына планаваў выкарыстоўваць для будоўлі на сваім участку, а частка ўжо пайшла на распальванне печы.

Па дадзеным факце раённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




## ЧАРОЎНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ПЕРЦУ

Гэтую гісторыю я пачуў у гарадской лазні. Расказаў яе, можна сказаць, сябар па парылцы, сталы чалавек. Мне (чаго не зробіш для любімай рубрыкі ў любімай газеце?!) засталося толькі запісаць. Такім чынам...

«Мы, падлеткі, не любілі дзядзьку Лявона, — гучала ў нашай парылцы. — Хата яго была першай пры ўездзе ў вёску, альбо апошняй пры выездзе. Гэта — як палічыць... Галоўнае, што за ёй, прычым непадалёку рос вялізазны дуб, пад якім вечарамі збіралася ўся дзятва. І не проста каб «патусіць», як сёння кажуць. Да найтаўсцейшага з дубовых сукоў там ланцугамі мацавалася шырокая дошка — атрымліваліся арэлі. На зіму яны здымаліся, а як толькі сыходзіў снег, хлопцы іх выцягвалі са схованкі і гуртам, урачыста, «адкрывалі сезон»: неслі на месца — мацавалі на дуб. Гэта была традыцыя, якой трымалася не адно пакаленне вясковай моладзі. А там, дзе яна, там, вядома ж, і крык, і смех, і піск дзяўчат — амаль да паўночы... Ды яшчэ і кожны вечар.

Дзядзьку Лявона гэта, відаць, раздражняла, не давала заснуць. І тады ён забываўся, што сам жа вырас пад гэтым дубам, — хапаў нейкую чаплу ці вілкі, бег да арэляў, разганяў адтуль шумнае «варанне» — псаваў яму вечар, што маладым, вядома ж, не падабалася. Яны думалі, як адпомсціць і...

Дзядзька быў вялікі аматар лазні, прычым парыўся абавязкова адзін, балазе, што лазня была свая і стаяла наводшыбе, у канцы гарода.

Што надумалі хлопцы? Яны сабралі малых (нам гадоў па восем было) і далі піянерскае даручэнне: па-першае, назіраць за тым, як дзядзька будзе тапіць лазню; па-другое, чакаць, пакуль, натапіўшы, ён туды зойдзе з венікам, а назад выйдзе без (звычайна ён у хату хадзіў па бялізну); па-трэцяе, у гэты момант хуценька матнуцца ў лазню, каб у тазік, дзе распарваецца венік, усыпаць вось гэты парашок (нам уручылі чырвоны молаты перац у шкляной бутэлечцы) і паспець размяшаць...

Мы пастараліся і ўсё зрабілі, як трэба, потым — сядзім у засадзе, чакаем, што ж будзе далей. І... нічога такога: дзядзька, бачым, з бялізнай пад пахай пайшоў у лазню, мыецца, відаць...

Мы ўжо з засады павылазілі, нам збрыдзела нечага чакаць! І тут — кіно і немцы: з прылазніка куляй вылятае дзядзька; голы, з нейкім звярыным рыкам нясецца ў бок хаты, крычыць там: "Вадой, вадой аблівай!"... Праўда, гэтага мы ўжо не бачым...

«Пацярпелы» потым сам расказаў (і не нам, вядома ж), як па прывычцы залез на палок, як добранька пасядзеў-прагрэўся там, як стаў аблівацца потам і падкінуў парку, як нарэшце ўзяўся за венік — стаў біць ім па нагах, па жываце, як адчуў, што ўсё цела стала гарэць нібы на агні... «Добра, што жонка дома была і вада ў вёдрах халодная...»

Ну а далей дзядзька «абследаваў» венік і тазік — знайшоў прычыну. Але ж вінаватых шукаць не стаў. Больш за тое, перастаў з чапялою бегаць да дуба. «Ведаеце, — мужчынам казаў, — пасля той працэдуры як быццам памаладзеў, з дзясятак гадоў з сябе скінуў... І засынаць лепей стаў: галава да падушкі і ўсё».

Вось такія нечаканыя былі наступствы. І, можна сказаць, засталіся, бо ў вёсцы, калі нехта шпарка бяжыць, да сёння пытаюць: «Ты гэта куды — як Лявонка з лазні?»

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## ЗА КАХАННЕ!
### І на гэтым свеце, і на... тым!

У народзе кажуць: «Не лягчэй будзе жыць, калі станеш галасіць». Гэта, між іншым, чыстая праўда! І добра, што нашы людзі не проста ведаюць яе, а яшчэ і кіруюцца. Я па Аляксандраўне сваёй мяркую — добрай даўняй прыяцельцы.

...Нядаўна ў яе гадавіна была — па смерці мужа. З сынам яны на могілкі з'ездзілі, завезлі кветкі, «праведалі» нябожчыка. Пашкадавалі яшчэ, што пасядзець не выпадае: сыну тэрмінова на работу трэба было...

Такім чынам, маці адна прыехала дамоў (людзей не збярэш — вірус), успомніла, што ў запасе ёсць бутэлька віна. Дастала з секцыі два бакалы — для сябе і свайго Антонавіча, узяла бутэльку...

Як на тое ліха, штопар зламаўся. Ну не ісці ж у пазыкі?

Узяла малаток і малы дыванок, выйшла з імі на лесвічную пляцоўку — адбіла ў бутэлькі горла, на ўсялякі выпадак працадзіла кагор, наліла ў фужэры...

Узняўшы свой, падзякавала мужу за сына, за пражытыя разам гады, за тое, што, любячы, ён знасіў усе яе недахопы... Выпіла свой бакал. Мужаў застаўся на стале...

Пасядзела. Не без таго — крыху паплакала, а ўрэшце, уздыхнуўшы, падумала, што не прападаць жа дабру: трэба выпіць і мужаў бакал! Але ж спачатку, як быццам, нешта сказаць (пры тым, што галоўнае сказана?).

Міжволі ўспомніла, што ў іх з чалавекам агульная прыяцелька была. Падабаўся ёй Антонавіч! І не хавала: так, здаецца, і закруціла б нейкі раман, але...

На той свет яна першай сышла. На правах старажыла магла там Антонавіча сустрэць. «Дык ты не губляйся там, — дазволіла мужу ўдава. — Не крыўдзі жанчыну. Мяне, можа, доўга чакаць»

На гэтым слове яна асушыла другі бакал і ўзялася за хатнія справы.

...Не ведаю, як вам, а мне дык было смешна слухаць гэтую гісторыю: міжволі ўспомнілася: «Божа, дай мне сілы змірыцца з тым, што змяніць не магу, дай мужнасці змяніць тое, што магу, і мудрасці, каб адрозніць адно ад другога».

**Альвіна Чайкоўская,**
*г. Гомель.*

## ДАЮЦЬ — БЯРЫ...

Здалёк пачну: у адной жанчыны хлеба не было — пайшла ў краму. Бачыць, а там, пры ўваходзе, мужчынка ляжыць — сімпатычны, хоць і п'яны... «Буду ісці назад, падбяру», — вырашыла жанчына. І, як быццам, хутка вярнулася, а мужчынкі няма: нехта апярэдзіў... Яна з той крыўды як не мацюкнулася: «Можна падумаць, я месяц хлеба не ела!»

Гэта, як вы зразумелі, анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Суседзі мае Жэка і Маня розную садавіну-гароднiну вырошчваюць, на Дзявятках (гэта ў Рагачове базар такі) прадаюць. Гэтай вясной, як казалі, бульба з буракамі добра ішлі — з мінулага ўраджаю: на новы ў людзей пакуль грошай няма...

Але ж святы — гэта ў нас святое! Мы іх з размахам любім адзначаць, не эканомячы. Хоць у сёлетнім маі, можа, і варта было, бо святаў там шмат — адно перацякала ў другое. А напярэдадні продажы раслі. І не толькі ў крамах.

...На базары найбольшым попытам Жэкаў хрэн карыстаўся. Адмысловы прадукт! Гэта не толькі пакупнікі прызнаюць, нават яго канкурэнты. Што не дзіва: у Жэкі свой фірмовы рэцэпт, своя правераная часам тэхналогія, дзе да грамулечкі ўсё ўзважана і прамерана, дзе вытрымана кожная драбяза, не кажучы ўжо пра тэмпературны рэжым пры заквасцы буракоў...

Дык вось сёлета Жэка дзесяць літраў хрэну зрабіў і ўсе чыста прадаў! Нават мала было: пастаянным кліентам і тым не хапіла!

А між тым найвышэйшую адзнаку атрымаў не гэты прадукт — зусім іншы.

...Значыць, перад Вялікаднем суседзі зноў сабраліся на Дзявяткі, загрузіліся розным таварам. Для асартыменту (хрэн — само сабой...) Маня шніт-цыбулі настрыгла. Сімпатычнай такой — з тоненькім пер'ем. На базары засталося толькі разлажыць усё ды... прадаць: гаспадару — бульбу, моркву, буракі ды свой хрэн, гаспадыні — яйкі, фасолю, гарбузы і тую цыбульку (у прадаўцоў там нават канкурэнцыя: хто больш грошай выручыць...)

А народ між тым ужо падыходзіць, тым-сім цікавіцца...

— Што гэта за цуд такі?! — пытае нейкая цётка, разглядаючы цыбульку. (Гаспадар толькі касавурыцца, бо казаў, што на гэтую «фігню» ніхто і не паглядзіць.)

А цётка, між тым, купіць збіраецца, праўда, на зваротным шляху... Па базары, маўляў, паходзіць...

І, галоўнае, не падманула: і сапраўды вярнулася — хвілін праз 20.

— А дзе цыбулька? — пытаецца.

— Няма, — кажа ёй Маня. — Разабралі ўсю.

Такога «аблому» жанчына, відаць, не чакала:

— Во блін! — ляпнула ўголас. — Можна падумаць, я год базару не бачыла...

...Жыццё, як анекдот? Што цікава, пра Жэкаў хрэн так ніхто ні разу не сказаў, нават той, каму не хапіла!

Адкуль выснова: бачыш нешта патрэбнае, — хоць мужчынку, хоць вітамінку — бяры, не чакай, пакуль возьмуць іншыя.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж:** гісторый у пошце то пуста, то густа, і ўсе яны, вядома ж, розныя. Адны, бывае, адразу просяцца... у архіў, іншыя — на старонкі газеты, трэція — у адмысловую папачку, каб там «адляжацца», пачакаць свайго часу.

Дык вось, нядаўна дзве гісторыі там «сустрэліся»: гэта значыць, да той, што чакала сваёй чаргі, прыйшла новая.

Што цікава, у абедзвюх адзін і той жа аўтар, а тэксты — як неба і зямля, бо першую чалавек, відаць, сам пісаў — з любоўю, з веданнем «справы» і роднай мовы, а вось другую (можа, не могучы?) — ужо камусь дыктаваў...

Адкуль выснова: хочаце нешта расказаць, напісаць — не адкладвайце гэта на потым. Пішыце! Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў.

Неасабісты суб'ектыў



# ЗЛАДЗЮЖКІ І ЗЛАДЗЕІ

## Як першыя ператвараюцца ў другіх, і як хто ім у гэтым дапамагае

Калегу ў канцы красавіка вельмі далікатна абакралі. Як так? Раскажаю. У яго дача дзесьці ці то пад Нясвіжам, ці то пад Капылём — вясковая дзедава хата. Хата сапраўды «дзедава»: вокны ў ёй старыя, драўляныя, на новыя шклопакеты ніхто не мяняў. На адным акне дачнікі паставілі расаду, а самі з'ехалі да наступных выхадных. Прыязджаюць праз тыдзень — шыба ў акне акуратна выстаўлена, памідоры ў скрыньцы, якія перашкаджалі злодзею залезці, гэтаксама акуратна з падаконня перастаўлены на ложак... Злодзею, дакладней, зладзюжку, патрэбна было зусім няшмат. Ён забраў чакушку гарэлкі, што стаяла на кухні ў шафцы, і шакаладку, што там жа ляжала на стале. Прычым выпіў і закусіў «не адыходзячы ад касы», пакінуўшы пустую бутэльку і абгортку на той жа кухні. Больш з хаты нічога не вынес. Хоць там вялікага багацця і няма, але ж пажывіцца пры жаданні можна было. Сякерай, напрыклад. Ці качаргой.

Міліцыю гаспадары ўсё ж выклікалі — не кожны ж дзень у акне шыбу вымаюць. Злодзея вылічылі хутка — мясцовы выпівоха ўжо даўно быў на прыкмеце, да таго ж суседзі бачылі, як ён каля падворка круціўся. Той нават і не аднекваўся: так, залез, бо надта ж хацелася выпіць... Паглядзеўшы на яго, дачнікі пісаць заяву не сталі: што з яго возьмеш, дый урону ўсяго на сем рублёў, якія ён вярнуў, — не садзіць жа чалавека ў турму за шакаладку. (Падазраю, што галоўным аргументам на карысць злодзея была пашкадаваная ім расада, бо мог жа і звярнуць.) Карацей, зладзюжка нават не спалохаўся, а «пацярпелыя» расказвалі гэтую гісторыю хутчэй як анекдот, паблажліва пасмейваючыся...

Праўда, роўна да таго часу, пакуль, прыехаўшы ў канцы мая ў вёску, не даведаліся, што іхні зладзюжка ўжо зрабіўся сапраўдным злодзеем: абнёс у навакольных вёсках некалькі хат, прычым ужо не па дробязі. У таго скраў бензапілу, у таго — трымер, у бабулі вынес з хлеўчыка дзвюх гусей. З адной хаты знёс дваццаць бутэлек гарэлкі (гаспадыня-дачніца збіралася ў вёсцы сыну вяселле рабіць). «Як жа ты данёс?» — здзіўлена спыталіся следчыя, бо несці накрадзенае дадому трэба было ноччу кіламетры чатыры праз лес. «Цяжка, — уздыхнуў злодзей. — Але я спынюся, прысяду, глытну крыху з бутэлькі ды далей іду...»

Нягледзячы на нежартоўны ўрон, які нанёс гэты таварыш людзям, усё роўна крыху смешна, праўда? Можна нават у «Народ на проваdze» гэтую гісторыю напісаць. Але, калі сур'ёзна, пасміхацца тут асабліва няма з чаго. Намалявалася праблема, якую можна абазначыць так: як блазны становяцца мярзотнікамі і хто ім у гэтым дапамагае.

Яно ж у вёсцы так здаўна вядзецца: заўсёды ёсць некалькі чалавек недарэк або п'яніц, што выклікаюць не столькі абурэнне, колькі кпіны. А і праўда: ляжыць сабе чалавек на грудку, не дайшоўшы да хаты, сабакі каля яго заднюю лапу падымаюць — чаму б не пасмяяцца. А можа, і паблажліва: разбудзіць ды памагчы ўстаць на ногі. Заўтра ён прыйдзе прасіць пахмяліцца, ты яму паблажліва скажаш: ідзі адсюль, ён і пойдзе. А калі надумае з двара пацягнуць тое, што дрэнна ляжыць, — выспятка пад зад яму — вось і ўсё пакаранне. Блазен, што з яго возьмеш... Так было спрадвек.

Дакладней, так было раней, пакуль у вёсцы жыло шмат маладых дужых людзей, і гэтыя самыя блазны былі ў колькасці арыфметычнай пагрэшнасці ад агульнага. Але ў многіх невялікіх вёсках сітуацыя сёння крыху іншая. Жывуць пастаянна там у асноўным людзі сталага веку, якія пастаяць за сябе не вельмі могуць, таму недарэкі, што ў вёсках не перавяліся, а, наадварот, размножыліся, пачуваюць сябе пеўнямі. І галоўнае — беспакаранымі. Не таму, што міліцыя не знойдзе, — таму, што ў міліцыі падставы затрымліваць можа не знайсціся.

Магчыма, памятаеце, я ўжо ўзнімала гэтую тэму, калі падобную гісторыю даслала ў рэдакцыю чытачка з Навагрудскага раёна. Яна адмовілася пазычыць п'яніцу грошы на апахмел, і пакрыўджаны дзяцюк скраў у яе тэлефон. Не каб прадаць — апарат быў стары, танненькі, — а проста каб папсаваць бабулі нервы: выйшаўшы за двор, ён проста выкінуў тэлефон у куст. Бабуля выклікала міліцыю — і вы думаеце, яму за тое нешта было? Нічога, хіба лёгкі спалох. Бо мабільнік быў танны і прадавец зладзюжка яго не збіраўся. Не дацягвае да крымінальнай справы...

Гэта калі пра бабулю. А што ж маладзейшыя-здаравейшыя, спытаеце. Яны ж хоць у нейкай колькасці ёсць, а як на дачы летам папрыязджаюць, дык і ўвогуле шмат. Мне нядаўна яшчэ адну гісторыю пра вясковых зладзеяў падкінулі. Якія ў моцнага нестарога гаспадара пакралі са склепа ўсё, што там было: і моркву, і бульбу, і буракі. Урон быў даволі буйны: адной бульбы — дзесяць мяхоў. Усё на крымінальную справу цягнула. Злодзея знайшлі, а справу... заводзіць не сталі. Бо абкрадзены падумаў-падумаў, дый паменшыў колькасць украдзенага. Пашкадаваў, дый жыць у адной вёсцы пасля з гэтым чалавекам давядзецца. А ён ужо не блазен, і не зладзюжка, ён — злодзей. Якога трэба калі не пабойвацца, дык асцерагацца і па магчымасці ніякіх спраў з ім зусім не мець...

Хто яму і іншым «героям» напісанага тут дапамог на больш высокую ступень нягоднiцтва ўскараскацца — прапаную дадумаць самім чытачам.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

